Беларусь Спартыўная

СПЕЦЫЯЛЬНЫ ПРАЕКТ «НОВАГА ЧАСУ» | novychas.by

5 СПОРТ, ЯКІ МОГ СТАЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНЫМ



6–7 НАТАЛЛЯ ПЕТРАКОВА: ЖЫЦЬ ХОЧАЦЦА ДЛЯ БЕЛАРУСІ — НОВАЙ, СВАБОДНАЙ, БАГАТАЙ




Фота Радыё Свабода

# Яны не ружовыя поні

Сяргей КАЙКО

**Дзясяткі гадоў беларускія спартсмены былі амаль што мэбляй у грамадска-палітычным інтэр'еры Беларусі. Яны практычна не вызначалі сваю грамадзянскую самасвядомасць. Не выказвалі якога-кольвек пэўнага стаўлення да падзей у краіне. Жылі як жылося. Спаборнічалі як спаборнічалася. Спажывалі тое, што давала дзяржава, — і пры выпадку шчыра дзякавалі.**

Хадзілі на ўрачыстыя рауты ў дні вялікіх перамог, дзе чулі пафасныя словы ад уплывовых мужчын у пінжаках і пад гальштукамі. Хадзілі на з'едлівыя разносы ў дні балючых паразаў, на якіх ад тых жа людзей у дарагіх гарнітурах атрымлівалі ў хвост і ў грыву.

Але ж неяк жылі, неяк маяліся, не надта задумваючыся пра астатні соцыум, палітыку і выбары. Не надта заганяючыся думкамі пра сцяг, гімн і нацыянальную існасць. «Рэч у сабе», — па-філасофску разважалі на гэты конт заўзятары. «Хто дзяўчыну вячэрае, той яе і танчыць», — метафарычна канстатавалі журналісты. «Былі ў селяніна тры сыны: двое разумныя, а трэці — спартсмен», — кпілі жартаўнікі. І ўсе агулам беларусы працягвалі за сваіх землякоў перажываць — на чэмпіянатах Еўропы і свету, на Алімпійскіх гульнях.

Юлія Несцярэнка з бліскучай перамогай на Алімпіядзе ў Афінах арганічна пазіравала ў фотакамеры з чырвона-зялёным сцягам. Дар'я Домрачава пасля трох залатых медалёў у Сочы – 2014 без аніякіх кагнітыўных рэфлексій абдымалася з Аляксандрам Лукашэнкам. Мікалай Казека са сваімі геніяльнымі фрыстайлістамі з удзячнасцю прымаў дзяржаўныя шанаванні і рэгаліі.

Сацыяльна-палітычныя матывы прабіваліся ў спорце рэдка і нібыта міжволі — як зялёныя парасткі праз асфальт. Як «Голас Амерыкі» ў савецкі радыёэфір у часы халоднай вайны. Нехта ў інтэрв'ю ўскосна намякаў на прывабнасць бел-чырвона-белага сцяга ды Пагоні. Нехта ахвотна і паважліва казаў пра прыгажосць беларускай мовы, ці нават спрабаваў на ёй размаўляць. Зрэдку згадваліся тыя старонкі гісторыі, якія не асабліва ўкладваліся ў закарэлыя межы дзяржаўнай ідэалогіі. У такіх выпадках сеціва гучна ўзбуджалася і шквалам каментароў ухваляла гэтыя патрыятычныя памкненні.

А большага ад спартсменаў і не чакалі. Бо што, маўляў, ад іх узяць, ад атлетаў, у якіх сіла не ў галаве, а ў біцэпсах і трыцэпсах. Што могуць сказаць ці здзейсніць яны — хто чытае не Быкава і Салжаніцына, а план чарговага падрыхтоўчага мікрацыкла, і жыццё бачыць праз шыбы трэніровачнай базы ў турэцкім Белеку.

Мінулае лета паказала, як моцна мы памыляліся. Як недаацэньвалі сваіх атлетаў. Як легкадумна параўновалі іх з тымі ружовымі поні, якія жывуць у сваім космасе.

А яны не поні — і ўся Беларусь гэта даўно ведае. Ведае, што беларускі спорт не застаўся ў баку ад усёй той жудасці, якая абрынулася на краіну пасля 9 жніўня. Што ён вельмі хутка вылучыўся ў самастойны — і надзвычай яскравы — чыннік пратэсту. Тысячы прадстаўнікоў галіны падпісалі знакаміты адкрыты ліст за сумленныя выбары і супраць гвалту. Сотні з іх выходзілі на маршы і шэсці ці праяўлялі іншыя пратэсныя актыўнасці. Дзясяткі аб'ядналіся ў магутную суполку — Саюз свабодных спартсменаў — і заснавалі свой Фонд салідарнасці, і павялі сваю барацьбу за лепшы лёс. І атрымалі першыя гучныя перамогі.

**Беларускі спорт аформіўся ў сталы сегмент пратэсту. Сталы — і, як ні дзіўна, адукаваны, разумны, дасведчаны. Менавіта яны, учарашнія куміры, якім пляскалі трыбуны, сёння гучна гавораць з іншых трыбун.**

За гэта сістэма іх біла і працягвае біць. Бадай, нават больш жорстка, чым іншых — айцішнікаў, студэнтаў, медыкаў, заводчан. «Бо як жа, — разважае тыповы чыноўнік вертыкалі. — Мы ж іх выкармілі сваімі грудзьмі. Выгадавалі сваімі грашыма і нервамі. Падрыхтавалі да вялікіх перамог». Менавіта так думае ўлада, здзяйсняючы традыцыйную падмену паняццяў. Блытаючы ўласныя сродкі са сродкамі падаткаплацельшчыкаў, перабольшваючы свой сціплы ўнёсак і зневажаючы заслугі саміх спартсменаў — іх катаржную працу, іх таленты, іх самаадданасць на шляху да высокай мэты.

Зрэшты, вертыкальшчыкаў можна зразумець. Яны такога проста не чакалі. Раней спартсмен калі і прыходзіў у палітыку, то строга праз парадны ўваход. Станавіўся дэпутатам і глыбакадумна працаваў штаны на паседжаннях. Ці рабіўся студэнтам-завочнікам Акадэміі кіравання, каб потым уціснуцца ў мяккае крэсла. Ці адразу спрабаваў сябе на дзяржаўнай службе, цалкам падзяляючы каноны «стабільнасці і квітнення».

Такіх, нібыта прышлых са старонак вядомага рамана, — маладых, даўганогіх, палітычна пісьменных — беларускі рэжым любіў і песціў. Пра такіх гаварыў славутыя словы, маўляў, спартсмены — лепшыя дыпламаты.

І тут раптам — на табе! Шчыльныя шэрагі атлетаў нечакана намалёўваліся не ў міністэрскай прыёмнай з сарамлівымі просьбамі, а на перадавой пратэснага руху на праспектах і плошчах сталіцы.

Рэжым умее біць — у гэтым яму не адмовіць. Спрактыкаваная і вымуштраваная, сілавая сістэма гатовая выконваць любыя загады па графіку 24/7. І мы ўжо не аднойчы пісалі, як беларускія спартсмены сядзелі на Акрэсціна і ў Жодзіна, пакутавалі ў карцары, атрымлівалі па рэбрах, выплочвалі штрафы, страчвалі працу і магчымасць працягваць кар'еру... Альбо вымушана з'язджалі за мяжу, як Аляксандра Герасіменя ці Аляксей Кудзін.

Беларускі спорт аформіўся ў сталы сегмент пратэсту. Сталы — і, як ні дзіўна, адукаваны, разумны, дасведчаны. Менавіта яны, учарашнія куміры, якім пляскалі поўныя трыбуны, сёння гучна гавораць з іншых трыбун. Міжнародных, дыпламатычных, на добрай англійскай мове. Менавіта яны атрымліваюць перамогі, якіх не могуць дамагчыся прафесійныя апазіцыйныя палітыкі. Адмена ў Мінску чэмпіянату свету па хакеі — гэта яго, Саюза свабодных спартсменаў, поспех. Санкцыі на кіраўніцтва Нацыянальнага алімпійскага камітэта, уключна з Лукашэнкам, — гэта яго трапны стрэл.

І яны працягваюць сваю працу, сваю барацьбу. Нягледзячы на цяжкасці і небяспеку, на памыі, што льюцца са старонак дзяржпрэсы, — і дзякуючы падтрымцы вольных беларусаў, якія цяпер глядзяць на айчынны спорт іншымі, шырока расплюшчанымі вачыма.

Зрэшты, пра гэта мы таксама ўжо не аднойчы ўзгадвалі. А прадмова, як казаў Даўлатаў, трошкі зацягнулася. Яны не поні — і гэта крута. Яны заслугоўваюць шмат добрых слоў — і словы гучаць.

Пра спорт ва ўсіх яго праявах мы нават вырашылі зрабіць спецвыпуск, чаго ў гісторыі «НЧ» яшчэ не было. Але ж калі жыццё дорыць нам прыемныя сюрпрызы, гэта варта адзначыць асобна.

# Мікалай Януш: бамбардзір і сапраўдны беларус

Уладзімір ПІРОГ

**У беларускім футболе хапала і больш яскравых фігур, чым Мікалай Януш. Аднак нельга адмаўляць таго, што за кошт стараннага і прафесійнага падыходу да справы ён дасягнуў шмат.**



Фота прэс-службы ФК «Шахцёр»

**«Мы павінны размаўляць на сваёй мове. Беларусы мусяць быць беларусамі»**

Гулец з правінцыі, без асаблівых умоваў дзіцяча-юнацкай падрыхтоўкі ў родных Мікашэвічах, ён заслугоўвае вялікай павагі. Бадай, ніхто не будзе спрачацца і з тым, што Мікола надзвычай цікавая фігура не толькі ў сэнсе забітых галоў. З ім заўсёды было прыемна паразмаўляць. Прычым не толькі падчас актыўнай кар'еры, якую форвард завяршыў нядаўна, у 36 гадоў. Ён увогуле цікавы персанаж, пацверджаннем чаму — актыўная дзейнасць у сацсетках, дзе Януш абзавёўся даволі шматлікім гуртом падпісчыкаў.

## Прайшоў загартоўку «Гранітам»

Пяты бамбардзір у гісторыі чэмпіянату Беларусі. Другі яго снайпер (85 мячоў) за апошняе дзесяцігоддзе (2011–2020). 307 матчаў і 107 галоў у Вышэйшай лізе. Цалкам за прафесійную кар'еру — 569 гульняў і 168 галоў. Два Кубкі краіны, тры сярэбраныя і чатыры бронзавыя медалі чэмпіянату. Лепшы яго бамбардзір (2014 і 2015), а таксама лепшы нападаючы (2015).

Згадзіцеся, нішто сабе візітка. А пачыналася футбольная сцежка Януша ў дзясятым класе першай сярэдняй школы Мікашэвічаў. Тады, у лютым 2001 г., 16-гадовы хлопец трапіў на прагляд мясцоваму «Граніту», што гуляў у першай лізе. Звычайна гэта школа жыцця побач з «дзядзькамі». Так і сталася — дысцыпліна, субардынацыя.

«Было цяжкавата: раніцай у школу, пасля абеду робіш урокі і на трэніроўку. Так стамляўся, што пасля вячэры клаўся спаць у восем гадзін, — успамінае Януш. — Заўсёды ведаў, што мячы, манішкі, увесь інвентар вісіць на табе. На трэніроўцы мог памыліцца і пачуць ад старэйшых такі набор слоў, што ў аніводным слоўніку не знойдзеш. Я тады і так быў скаваны ад страху перад дарослымі гульцамі і часта нерваваўся. А калі яшчэ страчваў мяч і атрымліваў "па вушах", то ўвогуле прабіраў "калатун". Але гэта школа жыцця, якая дапамагае і загартоўвае характар».

## Ніколі не быў «папрыгунчыкам»

Вось так, з малой радзімы, усё і стартавала, расцягнуўшыся на 20 гадоў у футболе. Дарэчы, Януш ніколі не адносіўся да катэгорыі так званых папрыгунчыкаў, што мяняюць клубы, як пальчаткі, гонячыся за доўгім рублём. За «Граніт» гуляў дзевяць сезонаў. А потым, пасля неадназначнага двухгадовага перыяду ў брэсцкім «Дынама», знайшоў сваю галоўную каманду — салігорскі «Шахцёр».

Ля калійных тэрыконаў з 2012 г. Януш і сабраў усе свае рэгаліі. Тады ж дэбютаваў у зборнай, а крыху раней і ў еўракубках. У выніку забіў за «Шахцёр» 93 галы.

Пра свой трансфер у Салігорск з Брэста форвард распавядаў з гумарам. Тады, у 2011 г., «Шахцёр» клікаў Януша з «Дынама» разам з паўабаронцам Андрэем Цэванам. Сам Мікола ўспамінаў гэта так: "Шахцёр" плаціў за нас абодвух 100 тысяч долараў. Дарэчы, я заўсёды казаў Цэвану, што за яго аддалі 90 тысяч, бо ён быў у выдатнай форме. А за мяне — толькі 10, па аб'ектыўных прычынах».

Цікава, што самым запамінальным матчам за гарнякоў Януш лічыць... прайграны. Але пытанне ў тым, каму і як. Ва ўпартай барацьбе ў Лізе Еўропы галандскаму ПСВ у 2014 г. Суперніку, за якога гулялі зоркі калібру Дэпая, Вейналдзюма, Люка дэ Ёнга. «Так, нас віны цісулі, але і "Шахцёр" быў вельмі збалансаваны ў плане гульні. Так, мы дзейнічалі ад абароны. Так, я зрэзаў мяч у свае вароты і сам не рэалізаваў выдатны момант — саступілі 0:1. Але ў першым у кар'еры матчы з грандам, лічу, у цэлым выглядаў добра — як і ўся каманда».

## Мог апынуцца ў БАТЭ

Пра Барысаў і Януша таксама ёсць прыкметная гісторыя, хоць і не рэалізаваная на практыцы. Гэта зараз «Шахцёр» чэмпіён, а яшчэ пару гадоў таму ў беларускім футболе непадзельна панаваў БАТЭ.

Трапіць у стан «жоўта-сініх» марылі многія. Былі шанцы і ў Міколы, прычым яшчэ да Салігорска. Легендарны бос БАТЭ Анатоль Капскі хацеў паклікаць яго ў каманду нават двойчы. Упершыню — калі Януш гуляў яшчэ ў «Граніце», але там не аддалі яго нават за 250 тысяч долараў. Другую спробу барысаўчане прадпрынялі, калі Мікалай правёў свой першы год у Брэсце і стаў там лепшым бамбардзірам. Тады дынамаўцаў узначальваў Юрый Пунтус — знакамітая фігура для БАТЭ. І ён шчыра сказаў Янушу: маўляў, «жоўта-сінія» зноў хацелі цябе запрасіць, але я вырашыў, што не аддам! «Шкадаваў, што пераход у Барысаў не здзейсніўся, — успамінае Януш. — Але потым супакоіўся. Лёс прывёў у "Шахцёр", і за гэта я яму ўдзячны».

## Шануе мову, цікавіцца гісторыяй

У сярэдзіне мінулага дзесяцігоддзя, калі Януш быў лепшым бамбардзірам чэмпіянату і атрымліваў першы вопыт гульні за зборную, ён быў адметны не толькі на полі. На традыцыйнай цырымоніі «Зорны мяч», дзе ўручалі статуэткі футбольным лаўрэатам – 2015, свае выступы ён зрабіў на роднай мове. Бадай, упершыню на гэтай цырымоніі футбаліст сказаў словы падзякі па-беларуску, пасля чаго не ўтрымаліся і некаторыя іншыя з выступоўцаў. Прыклад — вялікая рэч.

«Мы павінны размаўляць на сваёй мове. Прыезжыя спартсмены заўсёды ў інтэрв'ю здзіўляюцца: "А чаму вы па-руску гаворыце?". У савецкі час, калі прыязджаў чалавек з вёскі і размаўляў па-беларуску, усе да яго ставіліся як да калгасніка. Нават зараз такое засталося. А ўсё пачыналася ў той час. Усе ў вёсках размаўлялі па-беларуску. Адчуваю ўнутры стрыжань, які мяне трымае. Хачу, каб людзі мяне разумелі. Мы беларусы, мы павінны быць беларусамі», — і гэта таксама словы Януша.

Цікавіцца Мікалай і гісторыяй нашай краіны. У свой час яго захапіла кніга «Забытая Беларусь» Вадзіма Дзеружынскага: «Яна змяняе свядомасць. Атрымліваецца, калі капнуць глыбей, то беларусы, рускія і ўкраінцы — зусім не браты. Розныя мы... Або як уключалі ўсіх у Савецкі Саюз гвалтоўна, нікога не пытаючыся. А потым аддавалі наш Беласток Польшчы, Смаленск — Расіі. А Вялікае Княства Літоўскае? Гэта ж мы ліцьвіны, а не цяперашнія літоўцы. Але прыбалты заўсёды захоўвалі сваё нацыянальнае ядро. А мы, па вялікім рахунку, чым адрозніваемся ад рускіх, калі не гаворым на роднай мове?

Так, гэта непрыемна. Раблю ўрокі са старэйшым сынам — ён нічога не разумее ў беларускай лексіцы. Для яго гэта як замежная мова. Так крыўдна... Выдатна ведаю беларускую мову. Але вось калі да нас прыязджалі легіянеры, зайздросціў таму ж гульцу "Шахцёра" Мікалюнасу, калі ён тэлефанаваў дадому і размаўляў па-літоўску».

## Аслупянеў ад жорсткасці

Жнівень 2020 г. Януш выступае за « Іслач» з Мінскага раёна — апошнюю каманду ў кар'еры. І становіцца адным з герояў матча, у якім афармляе галявы дубль. Зрэшты, спартыўная тэма тады адышла на другі план. Святкаванне Міколам другога ўзяцця варот абляцела беларускія стужкі інтэрнэт-навін. Зямляк Святланы Ціханоўскай (так-так, ёсць і такі момант, абое з Мікашэвічаў, праўда, па дзяцінстве – юнацтве не перасякаліся, бо вучыліся ў розных школах) зрабіў яго такім чынам: дзве ўзнятыя ўгору рукі — са знакам вікторыі і сціснуты кулак.

«У гэтых жэстах мой крык душы, агонь, які бушуе ў грудзях. Мой пасыл накіраваны да людзей, што пацярпелі ў выніку гвалту, якія праяўляюць зараз салідарнасць у барацьбе з гвалтам. Кадры, што ўбачыў, абрынулі ў шок і жах. Я проста аслупянеў ад жорсткасці да маіх мірных беларусаў. Страціў апетыт, перастаў усміхацца і спакойна спаць, не мог думаць ні пра што іншае. Трэніроўкі здаваліся гэтакай дробязнай справай, якая нічога не азначае. І рэакцыя пасля гола — гэта выбух вулкана, які быў у мяне ўнутры».

## На поле больш не цягне

Пра сканчэнне кар'еры Януш таксама абвесціў адмыслова — ва ўласным тэлеграм-канале 9 студзеня. Маўляў, раптам адчуў, што на поле больш не цягне...

«Раней, гледзячы футбол з трыбуны, заўсёды рэагаваў на падзеі і думаў, што зрабіў бы ў той ці іншай сітуацыі. А тут я глядзеў... Проста глядзеў. І зразумеў, што гэта канец главы пад назвай "Коля Януш, забівай!". Я стаміўся пастаянна быць у раз'ездах, на зборах. Хачу больш часу праводзіць са сваёю сям'ёй. Хачу бачыць, як расце мой малодшы сын, як становіцца дарослым старэйшы. Яны хутка растуць, і я не хачу страціць гэты час.

Мне ўжо 36 год, і трымаць сябе ў тонусе ўсё цяжэй. Як бы прафесійна не ставіўся да справы, але траўмы ўжо здараюцца. У тым годзе з-за іх прапусціў 10 гульняў, такога не было даўно. Часта прыходзілася гуляць праз боль. І дакладна таксама мне прыйшлося б рабіць у наступным — я ўпэўнены, я сябе ведаю. А гэта пагражае атрыманнем больш сур'ёзных пашкоджанняў. Хочацца ўсё ж сысці са спорту здаровым чалавекам».

Ну а далей Мікола пачаў распавядаць і смешныя, і проста цікавыя гісторыі са свайго спартыўнага жыцця, з якімі цяпер ахвотна знаёміцца ўжо амаль тысяча падпісчыкаў. Хапае там і павучальнага для маладых футбалістаў. Накшталт таго, што футбол — гэта «не столькі пра "пайсці пабегаць", колькі пра работу галавою. Недарэмна ў супрацьстаянні Месі vs Раналду большасць трэнераў на баку Месі менавіта таму, што той практычна заўсёды прымае слушныя рашэнні».

Менавіта так Мікалай Януш і сам імкнецца ісці па жыцці. Жыве ў Салігорску. Нарэшце паўнавартасна займаецца гадаваннем сыноў. Пры гэтым не верыцца, што аднойчы яго зноў не пацягне ў футбол — ужо ў іншым статусе. Напрыклад, у ролі трэнера. Футбольны досвед пры ім, дыплом БДУФКа таксама. Ну, і думкі ў галаве здаровыя і вельмі правільныя для гэтай складанай прафесіі.



Марыя Калеснікава і «Крумкачы»: на адной хвалі

Фота «Трыбуна» Радыё Свабода

**«Крумкачы» зробленыя з іншага цеста. Яны жывуць на прыватныя сродкі — ад заснавальнікаў і спонсараў, і хочуць мець з таго эфект. Хай не камерцыйны, хай сацыяльны ці проста атрымліваць асалоду**

# Незвычайна фантастычныя. «Крумкачы», якія ўзрушылі беларускі футбол

Антон МАКАЎЧУК

**Беларускі футбол — гэта краіна ў мініяцюры. Іранічна яго называюць спаборніцтвам гарвыканкамаў, паколькі бюджэты амаль усіх клубаў напаўняе дзяржава і, адпаведна, многае залежыць ад лаяльнасці чыноўнікаў на месцах. Але ёсць адно выключэнне — «Крумкачы». Каманда, якую сама сітуацыя змушае называць народнай.**

Нават гісторыя яе стварэння выглядае так, што знарок не прыдумаеш. Як нейкі апокрыф, дагэтуль не зразумелы і не асэнсаваны закарэлай сістэмай.

Фармальна месцам нараджэння клуба можна лічыць форум спартыўнага рэсурсу pressball.by. Менавіта на гэтай пляцоўцы пазнаёміліся будучыя заснавальнікі клуба — людзі розных прафесій і рознага ўзросту. Агульнае ў іх было толькі адно — цікавасць да беларускага футбола, аб якім яны жыва дыскутавалі. Карацей, напачатку было слова — і вось як цудоўна яно потым матэрыялізавалася.

## Узнікненне

Рашэнне выйсці за межы форуму выспела ў 2014 г. Так з'явіўся аматарскі праект без пэўных перспектыў і гандлёвая марка «Крумкачы» (назву спецыяльна прыдумалі з беларускім гучаннем). Спартыўныя мэты былі толькі асабістыя — заснавальнікі самі хацелі згуляць хаця б па некалькі матчаў у другой лізе чэмпіянату Беларусі. Гэта ліга аматарская, заяўку туды можа адправіць любая юрыдычная асоба. Пры мінімальных, што важна, фінансавых гарантыях.

Праз знаёмствы і праз трэція рукі «Крумкачы» сабралі які-ніякі бюджэт, а з ім — і прыстойны склад для падобнай адысеі. Такі, што мара заснавальнікаў — засвяціцца на полі — для некаторых адразу адышла на другі план. Турнірныя апетыты саспелі не адразу, але ў нейкі момант стала зразумела, што ёсць перспектыва замахнуцца на больш высокі ўзровень і, адпаведна, стаць прафесійнай камандай. Вышыня была ўзятая з прыгодамі, але «Крумкачы» зарабілі пуцёўку ў першую лігу.

Тады яны яшчэ не былі «народнай камандай» у поўным сэнсе, але ўжо сталі з'явай у беларускім футболе. Асабліва на фоне іншых каманд першай лігі, якія жывуць па прынцыпе «абы не было вайны». Для атрымання бюджэтных сродкаў ім дастаткова проста ўдзельнічаць. Барацьба за высокія месцы не ўваходзіць у іх планы — на чарку і шкварку хапае, то і добра.

«Крумкачы» зробленыя з іншага цеста. Яны жывуць на прыватныя сродкі — ад заснавальнікаў і спонсараў, і хочуць мець з таго эфект. Хай не камерцыйны, хай сацыяльны ці проста атрымліваць асалоду, але ж грошы не казённыя — іх нельга закопваць у зямлю. Таму і ў першай лізе «Крумкачы» адразу паставілі напалеонаўскую задачу — падняцца яшчэ на адну прыступку. Яны не маглі прапанаваць футбалістам зайдросныя фінансавыя ўмовы, але прапанавалі амбітную мэту, светлую мару і добрую прэсу. У камандзе сабраліся гульцы, многіх з якіх ужо спісалі з футбола. Некаторыя нават паспелі змяніць прафесію і пачалі зарабляць на жыццё іншымі спосабамі. Хтосьці адкрыў краму разліўнога піва, хтосьці ўладкаваўся мерчандайзерам, таксістам або ахоўнікам.

Ужо падчас турніру каманду ўзначаліў Алег Дулуб — вядомы беларускі трэнер, які да таго знаходзіўся ў асноўным на другіх ролях. У «Крумкачах» у яго нарэшце з'явіўся доўгачаканы шанц на самастойную працу, і спецыяліст угрызся ў яго зубамі. Некаторыя гульцы прыходзілі менавіта «пад Дулуба», бо ў першай лізе далёка не ў кожнай камандзе ёсць магчымасць прагрэсаваць.

Гэтая гісторыя завяршылася на высокай ноце восенню 2015 г. Так выйшла, што лёс апошняга білета ў вышэйшую лігу вырашаўся на фінішы. Прэтэндэнты сустракаліся ў Мінску — «Крумкачы» і магілёўскі «Днепр». У першых была навізна адчуванняў, у другіх — вялікія традыцыі. «Днепр» доўга гуляў у вышэйшай лізе, а ў 1998 г. нават стаў чэмпіёнам. У першую лігу абласная каманда правалілася па нейкім непаразуменні, але прыйшлося затрымацца ў ёй яшчэ на год. «Крумкачы» выйгралі «бітву за вышку» з лікам 2:0. І здарылася гэта пры перапоўненых трыбунах САК «Алімпійскі», што на сталічнай вуліцы Сурганава. Уваход на трыбуны быў свабодным, і ў нейкі момант людзей перасталі пускаць унутр стадыёна, і яны шчыльна стулілі шэрагі за агароджамі.

## Росквіт

Пасля выхаду ў вышэйшую лігу «Крумкачы» сталі самым медыйным клубам Беларусі. Сацыяльнай з'явай, у якой хочацца ўдзельнічаць. З Сурганава яны пераехалі на Маякоўскага, паколькі «Алімпійскі» ўжо не адпавядаў патрабаванням. Клуб стаў развіваць не толькі спартыўны складнік, але і забаўляльны — і гэтым таксама рваў шаблоны. Матчам папярэднічалі розныя мерапрыемствы, у тым ліку выступленні вядомых гуртоў. На «Крумкачы» пацягнуліся сем'ямі, хоць падобная культура заўзення не характэрная для Беларусі. Прыхільнікі каманды нават папрасілі не называць іх фанатамі і замяняць гэтае вызначэнне на больш мяккае слова — заўзятары.

На гасцявыя гульні многія з іх дабіраліся цэнтралізавана, і ў праграму выезду абавязкова ўваходзіў не толькі футбол, але і культурная праграма з нацыянальнымі матывамі. Карацей, для беларускага футбола многае было, як у той песні, «упершыню і зноў». Дзякуючы «Крумкачам» ён атрымаў больш шырокае інфармацыйнае поле, за інфармацыяй пацягнуліся нават замежныя журналісты.

Вяхой стаў матч з мінскім «Дынама» ў 2016 г. Камандай з багатай гісторыяй, бо толькі яна ўдзельнічала ў вышэйшай лізе чэмпіянату СССР. Трыбуны не змаглі змясціць усіх ахвотных, відэатрансляцыі білі рэкорды прагляду. «Крумкачы» перамаглі 4:1, чым нечакана ўразілі беларускі футбольны соцыум.

Быў момант, калі каманда займала другое месца ў чэмпіянаце, але на адных эмоцыях далёка заехаць не ўдалося. Паўплывалі недахоп вопыту і фінансаў, «Крумкачы» мелі самы сціплы бюджэт сярод усіх удзельнікаў. Што не павінна здзіўляць, бо, нагадаем, клуб працаваў без падтрымкі дзяржавы, мог разлічваць толькі на ўласныя сілы. У дэбютны сезон у вышэйшай лізе «Крумкачы» фінішавалі на 11 месцы. Не так і drэнна для пачатку.

Аднак на наступны год палепшыць вынік не ўдалося. Жаданне скокнуць вышэй за галаву абярнулася фінансавай неплацежаздольнасцю. Па ходзе сезона каманда пазбавілася некалькіх вядучых футбалістаў. Перад матчам у Віцебску нават здарыўся страйк, у выніку чаго «Крумкачы» згулялі практычна рэзервовым складам. Але нават так здолелі ўвайсці ў гісторыю. Галкіпер Яўген Касцюкевіч змог забіць гол ударам ад уласных варот. Пасля ён жа зарабіў выдаленне, але ўсё-ткі «Крумкачы» адстаялі нічыйны вынік — 2:2.

Чым далей, тым больш складана — кваліфікаваных футбалістаў відавочна не хапала. Так, у цэнтры абароны гуляў футбаліст, які сумяшчаў кар'еру з працай у «Макдональдсе». Але каманда адстаяла месца ў вышэйшай лізе, фінішаваўшы на 13 месцы. Праўда, заявіцца на наступны год у эліту не атрымалася. Шлагбаум паставіла федэрацыя футбола, якая палічыла клуб фінансава неплацежаздольным. «Крумкачы» спрабавалі змагацца, але не знайшлі дзейсных мер у супрацьстаянні з дзяржапаратам.

## Адраджэнне

Юрыдычна клуб спыніў існаванне, але гісторыя атрымала працяг. Згаданы Касцюкевіч, а таксама група найбольш адданых заўзятараў, арганізавалі новую кампанію — «НФК "Крумкачы"». Выразнай расшыфроўкі абрэвіятура не мела, таму кожны мог дадумваць па ўласным жаданні. Як прыклад — народная футбольная каманда. Новыя «Крумкачы» зноў пачалі з другой лігі і зноў пераадолелі гэты бар'ер з першай спробы. Пасля гэтага даваліся канкрэтызаваць назву. «Незвычайная фантастычная каманда» — абрэвіятура НФК з тых часоў расшыфроўваецца менавіта так.

Сезон – 2020 «Крумкачы» правялі ў першай лізе, з відамі на эліту. І зноў занялі трэцяе месца. Аднак гісторыя ўжо не магла паўтарыцца цюцелька ў цюцельку. Рэгламент прадугледжваў толькі дзве прамыя пуцёўкі наверх. Трэцяя разыгрывалася ў супрацьстаянні з аўтсайдарам «вышкі». За месца пад сонцам «Крумкачы» змагаліся са «Слуцкам». Згодна з раскладам, гульні павінны былі адбыцца ў пачатку снежня, аднак з-за каронавіруса ў случчакоў іх прыйшлося пераносіць. Ужо і ўрачыстае закрыццё сезона з раздачай сланоў адбылося, а ўладальнік трэцяй пуцёўкі яшчэ не быў вызначаны.

У выніку абодва матчы прайшлі ў манежы, і фартуна ўсміхнулася «Слуцку». Праўда, на гэтым гісторыя не скончылася — і фактычна вылілася ў акт дэманстрацыйнай дыскрымінацыі ўнікальнага праекта.

Па-першае, федэрацыя заплюшчыла вочы на тое, што ў складзе «Слуцка» супраць мінчан гулялі нібыта дыскліфікаваныя футбалісты. А па-другое, БФФ не пусціла ў вышэйшую лігу «Крумкачоў» і пазней — калі праз банкруцтва з лігі выключылі «Гарадзею». Замест яе, паводле рэгламенту і простa логікі, у розыгрыш мусілі ўключыць менавіта сталічны клуб — як уладальніка трэцяга месца ў першай лізе — 2020. Аднак за кошт дзіўных трактовак правілаў вольнае месца аддалі «Смаргоні», якая фінішавала толькі шостай. У адказ на гэта пакрыўджаныя «Крумкачы» падалі скаргу ў УЕФА...

Чаму так, даўно не сакрэт. Чыноўнікі, мякка кажучы, клуб недалюблівалі. Бо як жа — ён у свабодным палёце і мае нахабства агучваць пазіцыю. Гэта «Крумкачы» ў мінулым сезоне выказаліся супраць гвалту. Гэта іх футбалісты і трэнер падпісалі ліст за сумленныя выбары, а некаторыя прайшлі праз дручкі і аўтазакі. Гэта на іх гульню аднойчы завітала Марыя Калеснікава, і каманда гучна вітала будучую палітзняволеную наўпрост у раздзявальні.

Зрэшты, справа не толькі ў палітыцы. У дадатак да ўсяго «Крумкачы» паказваюць безгрунтоўнасць дзяржаўнай сістэмы падтрымкі футбола. Дэманструюць, што плён можна атрымліваць пры куды больш сціплым фінансаванні. І адкрыта кажуць, што прывабнасць футбола — гэта не толькі лічбы на табло і месцы ў турнірнай табліцы, але і сам працэс. Які можа прыносіць людзям радасць, калі займацца справай натхнёна, крэатыўна і з душой.

# Сяргей Тарас: Лічу, што ўсё раблю правільна — і гэта не дарма

Георгій ЗАГОНСКІ

**Сяргей Тарас — чэмпіён Беларусі па валейболе ў складзе жлобінскага «Металурга». Гуляў за зборную і ў еўракубках. Але па завяршэнні кар'еры не проста сышоў са спорту, а кардынальна змяніў род дзейнасці. Сяргей стаў шахцёрам у Салігорску. Летам ён не змог застацца абыякавым да палітычных падзеяў у краіне. Падтрымаў забастоўку і сышоў у стачку. А ўжо восенню быў звольнены і двойчы адпраўляўся «на суткі».**



Фота з сацсетак

«Страйк пратрымаўся толькі тры дні, але мы ўбачылі: многія не згодныя...»



Фота з сацсетак

«Каманда два гады запар брала золата, і мне пашчасціла гэта заспець»

Аб сваім ранейшым і цяперашнім жыцці экс-спартсмен распавёў у інтэрв'ю «НЧ».

***— Вам цяпер 32. Маглі б яшчэ пагуляць.***

— Да завяршэння кар'еры падштурхнулі адразу некалькі фактараў. Па-першае, з'явіліся праблемы са здароўем. Напрыклад, грыжа хрыбетніка. Я яе выразаў і пасля гэтага гуляў яшчэ два гады. Але затым у чэмпіянаце Беларусі ўпалі заробкі. Мне было 28, і па сукупнасці ўсіх прычын зразумеў, што з валейболам пара заканчваць.

***— Упалі заробкі. Яны ўвогуле вялікія ў валейболе?***

— Калі я зыходзіў, у нашым чэмпіянаце зарплаты складалі ад 500 да 1000 рублёў. Больш было толькі ў «Шахцёры» і «Будаўніку», але туды імкнуліся ўсе гульцы, каб зарабляць хоць нейкія грошы. Ну, вось я і зразумеў: хопіць псаваць здароўе. Вырашыў, што з такім жа поспехам знайду іншую працу — па-за спортам.

***— Вы і чэмпіёнам краіны станавіліся.***

— Я тады малады быў. Гуляў за «Металург». Каманда два гады запар брала золата, і мне пашчасціла заспець першае з іх. Склад у нас тады быў што трэба. Памятаю, мяне выклікалі і ў зборную. З «Металургам», як пазней і з «Камунальнікам», выступаў у еўракубках.

***— Дзе лепш — у родным Гродна або ў Салігорску?***

— У любым з гэтых гарадоў можна знайсці нешта па-свойму цікавае. У Гродне ў мяне засталіся сваякі, сябры. Але да пастаянных пераездаў з месца на месца даўно прывык — яшчэ з 11 класа, калі з дому з'ехаў. Таму перабрацца ў Салігорск не было праблемай.

***— Шахцёры шмат зарабляюць?***

— У мяне зарплата была каля 2000 рублёў. Гэта сярэдні заробак. Прынамсі не самы вялікі сярод шахцёраў. А максімум залежыць і ад брыгады, і ад таго, на якіх комплексах працаваць. Наколькі ведаю, можна мець ад 3500 да 5000.

***— Брыгадзір мацавальнікаў на шахтах — што за праца?***

— Калі па-простаму, то мацаваць усё вакол, каб людзям нічога не падала на галаву. Інакш кажучы, трэба засцерагчы працоўную прастору. Адны здабываюць руду, другія яе на машыне развозяць, а хтосьці займаецца такім вось умацаваннем.

Гэта досыць цяжкая праца, якая пры гэтым не асабліва цэніцца. Даводзіцца ўвесь час мець справу з вялікімі вагамі. Нешта цягаць, падносіць, перарухаць, сячы, ламаць. Увогуле прыстойны фізічны занятак. Не кажу, што ў забоі зусім ужо лёгка. Але кіроўцы, ад якіх патрабуецца даехаць да камбайна з рудой і адвезці яе да канвеера, зарабляюць больш. Хоць, здаецца, проста круцяць «баранку».

***— Да мінулага лета вы глыбока ўнікалі ў палітыку?***

— Не сказаў бы. На гэта збольшага ўплываў спорт. Там твая асноўная задача — трэніравацца і ўдзельнічаць у спаборніцтвах. З грашыма нармальна, ды і наогул бесклапотнае жыццё. А затым я сышоў з валейбола. І прыкладна за год да выбараў пачаў цікавіцца тым, што адбываецца і ў нас у краіне, і ў суседзяў — ва Украіне, Расіі. Там жа «вясёлых» момантаў таксама хапае. Для гэтага стаў глядзець, чытаць, даведвацца.

***— Як вашае жыццё змянілі падзеі, якія сталі адбывацца з 9 жніўня?***

— Не працую. Знаходжуся ў стачцы. Двойчы пабываў у месцах не гэтак аддаленых.

***— Давайце па парадку. Калі ўсё толькі пачыналася, шахцёры зладзілі страйк, але ён хутка скончыўся. Засмучаныя?***

— Наадварот, я нават прыемна здзівіўся. Таму, што людзі хоць бы ўжо проста вырашылі падняцца і выйшлі на вуліцу. Збіраліся ў Салігорску на плошчы каля галаўнога будынка «Беларуськалія». Тут нармальна зарабляюць, калі параўноўваць са звычайнымі рабочымі. Так, страйк пратрымаўся толькі тры дні. Але мы ўбачылі: многія не згодныя з тым, што адбываецца. У той жа час народ баіцца, бо і крэдыты, і выдаткі, і гэтак далей. Гэта фінансавая залежнасць.

***— У якой стадыі цяпер ваша стачка?***

— Мы адмовіліся ад выканання працы. Усяго гэта дзесьці 120–130 чалавек. Хоць на прадпрыемстве каля 15 000 народу. Зрэшты, палова з іх — інжынеры, тэхнічныя работнікі, начальства.

***— Вам ад пачатку пагражалі звальненнем?***

— Калі сыходзіў у стачку, выдатна разумеў, што рана ці позна мяне звольняць. Але спрабавалі не пагражаць людзям, а хутчэй адгаворваць. Аднак я проста не адказваў на званкі начальнікаў. Не бачыў сэнсу з імі размаўляць. Гэта ўсё роўна, што пераліваць з пустога ў парожняе.

***— Як было абстаўлена ваша звальненне?***

— У стачцы я афіцыйна з 25 жніўня. А 11 верасня прайшоў суд аб непрызнанні законнасці нашага страйку. Вядома, яго прызналі незаконным. І на наступны дзень мяне звольнілі. Праўда, афармілі чамусьці якраз 25 жніўня — заднім чыслом. Хоць, калі зусім ужо па законе, то павінны былі 12 верасня. Гэта значыць толькі пасля суда. Скажам, за нявыхад на працу. Але там свае правілы.

***— Як і за што вас затрымалі 3 кастрычніка?***

— Гэта адбылося на акцыі ў Салігорску. Мы выйшлі ў Парк чатырох стыхій на чаяванне. Не было нейкіх плакатаў, выкрыкаў, лозунгаў. Проста размаўлялі, рабілі фота. Але, як паказала практыка, гэта і не патрабуецца. Дастаткова выйсці на вуліцу са сцягам, і пачынаюцца прыгоды. А тады супрацоўнікі пастаянна хадзілі вакол нас — глядзелі, здымалі, фіксавалі. Потым мы вырашылі сабрацца ў калону на экскурсію, якую збіраліся зладзіць для людзей, што прыехалі да нас з іншых гарадоў. Мог атрымацца марш. Але прайшлі ўсяго пару метраў, і адразу ж супрацоўнікі ў масках, апранутыя ў чорнае, перайшлі да дзеяння — набралі людзей у аўтазак.

***— Уцякаць не спрабавалі?***

— Нікуды асабліва не рваўся. Проста не бачыў у гэтым сэнсу. Тым больш я ростам два метры — прыкметны. Ну і было адчуванне, што бралі канкрэтных людзей, тых, хто ў стачцы.

***— Як з вамі абыходзіліся?***

— Не білі, як у абласных цэнтрах. А грубыя звароты на падвышаных танах, вядома, былі. Затым, калі прывезлі ў РУУС, прайшла стандартная працэдура. Пазабіралі ўсё — і шнуркі, і рамяні. Там мы прабылі трое сутак, і за гэты час ніякіх перадач і разгляду нашых спраў.

***— Абстаноўка ў камеры?***

— Не было элементарнага — ні зубных шчотак, ні туалетнай паперы, ні шкляначак. Чымсьці абзавяліся ўжо там — хтосьці нешта прынёс. Так званы выязны суд адбыўся ў самім РУУС.

Усіх асудзілі і адправілі ў розныя гарады. Мяне — на сем сутак у Старыя Дарогі. Там было лепш — і перадачы, і амаль усё, што трэба. Адзінае, не было туалета і крана з вадой. Замест іх вядро і пару бутэлек вады.

**Усіх асудзілі і адправілі ў розныя гарады. Мяне — на сем сутак у Старыя Дарогі. Там было лепш — і перадачы, і амаль усё, што трэба. Адзінае, не было туалета і крана з вадой. Замест іх вядро і пару бутэлек вады.**

***— Вы згадвалі і другую пабыўку за кратамі.***

— Гэта адбылося прыкладна праз месяц — у лістападзе. Мы паехалі на экскурсію ў Косава. Ёсць такая вёска каля Івацэвічаў, дзе знаходзіцца музей-сядзіба Тадэвуша Касцюшкі. Адправіліся туды якраз праз пару дзён пасля таго, як забілі Рамана Бандарэнку. Па дарозе, калі была абвешчаная хвіліна яго памяці, яе ўшанавалі. Яшчэ ў дарозе спыніліся ля помніка Кастусю Каліноўскаму. А затым рушылі да замка на экскурсію. Там таксама правялі акцыю ў памяць пра Бандарэнку. І тут да нашага аўтобуса пад'ехала міліцыя. Спачатку былі размовы, а затым каманда: «Давайце пакаваць!»

***— Што вам ставілі ў віну?***

— Меркавалі, што на судзе будуць фігураваць тыя фота, якія зрабілі на трасе па дарозе на экскурсію. Паседжанне сапраўды праходзіла па гэтай справе. Вось толькі працавалі органы па наводцы — сачылі за намі тады з самага Салігорска. А наогул, што першы, што другі суды былі фармальнасцю. Дарэчы, у мяне засталася копія пратакола. І на судзе там было шмат чаго выпраўлена і накрэслена ў параўнанні з першай версіяй, якую адправілі ў ІЧУ ў Івацэвічы.

***— Адтуль вас куды адвезлі?***

— На 13 сутак у Баранавічы. Быццам бы і недалёка ад Івацэвічаў, але мы дабіраліся вельмі доўга. Таму што ў адзінаццаць вечара нас засунулі ў аўтазакі гадзіны на тры. Мы ўсе гэты час проста сядзелі і чакалі, калі паедзем. Таму прыбылі ў Баранавічы толькі пад раніцу.

***— Якім было стаўленне да вас там?***

— Нішто сабе. Хоць усё, вядома, па-рознаму — гледзячы якая змена. Я з такім не сутыкаўся, але ў кагосьці забіралі матрацы. Нібыта за тое, што шумна сябе паводзілі. Яшчэ прымушалі пісаць тлумачальныя. Заўважыў, разам са мной там было шмат людзей, якіх забіралі ў Курапатах. А да канца майго тэрміну пачалі прывязджаць затрыманыя і на іншых акцыях. Дзяліліся з намі хоць нейкай інфармацыяй.

Але наогул нас пастаянна пераводзілі з камеры ў камеру. І не дзіўна, што ў такіх умовах распаўсюджваўся каронавірус. Я таксама захварэў — на трэці дзень. Добра, што ўсё прайшло ў лёгкай форме. Дзве таблеткі цытрамона і вада — вось і ўсё лячэнне. На наступны дзень тэмпературы ўжо не было. Затое перастаў адчуваць пахі — тады дакладна і зразумеў, што ў мяне «карона». Дарэчы, ад нас быццам бы і патрабавалі заўсёды апранаць маскі, але калі яна адна на ўвесь тэрмін, то...

І наогул, за наша здароўе там асабліва не перажывалі.

***— Не баіцеся, што затрымаюць зноў?***

— Такія асцярогі ёсць. Але дакладна гэтаму не буду здзіўлены.

***— Як вас змянілі падзеі гэтых месяцаў?***

— Ніяк. Настрой скача хвалямі. Але я як быў, так і застаўся верны сваёй пазіцыі. Лічу, што ўсё раблю правільна, — і гэта не дарма. А тое, што адбыў пакаранне, хай застанецца на сумленні тых, хто мне яго выпісваў. І наогул гэта меншае зло з магчымых. Асабліва калі параўноўваць з падзеямі, якія адбыліся 9, 10 і 11 жніўня. Якімі людзі выходзілі з Акрэсціна! А хтосьці наогул больш ніколі не ўбачыць сваіх блізкіх ды родных людзей. Так ці інакш, я ні аб чым не шкадую. І ведаю — яшчэ раз зрабіў бы дакладна гэтак жа.

Філіп МАЦЮШОНАК

**Беларускі суверэнны спорт у яго гульнявой частцы ў грамадскай свядомасці даволі трывала асацыюецца з хакеем. Прычын таму шмат: накладаюць свой адбітак падтрымка на самым высокім узроўні, дзяржпраграма «Лядовы палац у кожны райцэнтр», сталы ўдзел зборнай у элітных чэмпіянатах свету і выступ «Дынама» ў КХЛ.**


Уладзіслаў Кулеш: хутчэй, вышэй, мацней


Фота www.ihf.info
Арцём Каралёк: не стрымаць, не стрымаць

# Спорт, які мог стаць нацыянальным

Аднак ёсць гульнявы від, дзе і традыцый у беларусаў куды больш, і міжнародных поспехаў хоць адбаўляй. Гаворка пра гандбол, які ў 1980-я гг. быў нашым брэндам.

## Узыход і заход

У ручны мяч у Беларусі пачалі гуляць яшчэ ў 1950-я, у 1960 г. быў заснаваны першы прыкметны клуб — «Політэхнік», а росквіт у наш гандбол прыйшоў у 1980-я — са з'яўленнем невераготнага мінскага СКА.

У 1981 г. армейцы ўпершыню сталі чэмпіёнамі краіны, а потым пачалося іх трыумфальнае шэсце па пляцоўках не толькі СССР, але і Еўропы. Шэсць чэмпіёнскіх тытулаў, чатыры Кубкі, два Кубкі ўладальнікаў Кубкаў, тры Кубкі еўрапейскіх чэмпіёнаў... Хатнія матчы армейцаў збіралі аншлагі ў мінскім Палацы спорту, уся рэспубліка, можна сказаць, заўзела за гандбол.

Зразумела, ключавыя аўтары поспеху СКА кавалі каштоўныя металы і ў зборнай. У 1988 г. савецкая каманда выйграла золата Алімпіяды ў Сеуле, а ў яе складзе бліскалі беларусы Юры Шаўцоў, Аляксандр Каршакевіч, Аляксандр Тучкін, Георгій Свірыдэнка і Канстанцін Шараваў. Праз чатыры гады ў камандзе СНД тытулы алімпійскіх чэмпіёнаў Барселоны ўзялі Міхаіл Якімовіч, Андрэй Барбашынскі і Андрэй Мінеўскі.

З распадам СССР пачалася новая эпоха, і, вядома, яна закранула і гандбол. Суверэннай Беларусі шмат што прыйшлося пачынаць з нуля. Калі раней уся сістэма падрыхтоўкі была скіравана пад патрэбы СКА, то цяпер прыйшоў час будаваць процілеглую сістэму.

Незалежнай дзяржаве патрэбны быў свой чэмпіянат, армейцам — новыя беларускія супернікі. Хутка стварыць канкурэнтнае асяроддзе было немагчыма, краіна толькі вучылася жыць самастойна, усю постсавецкую прастору накрыў эканамічны крызіс. Працэс фарміравання клубаў ішоў цяжка, грошай бракавала.

Зборная Беларусі яшчэ на савецкім багажы змагла паказаць вынік. На чэмпіянаце Еўропы – 1994 нашы хлопцы ўвайшлі ў васьмёрку наймацнейшых каманд кантынента, а на чэмпіянаце свету праз год фінішавалі дзявятымі. Гэтыя вынікі дагэтуль найлепшыя за суверэнны перыяд.

Потым пачалося ліхалецце. СКА яшчэ дамінаваў на ўнутранай арэне, але ў еўракубках ужо не бліскаў. Зборная ніяк не магла кваліфікавацца на топ-турніры. Змена пакаленняў праходзіла вельмі марудна і з вялікімі цяжкасцямі. На мяжы стагоддзяў, здавалася, з'явілася надзея. Яе звязвалі з імёнамі двух Сяргеяў — Рутэнкі і Гарбака. Аднак амбітныя гандбалісты, расчараваныя айчыннымі рэаліямі, змянілі спартовае грамадзянства. Рутэнка стаў выступаць за зборную Славеніі, Гарбок перайшоў пад сцяг Расіі.

## Новыя хвалі

Рэнесанс ручнога мяча ў Беларусі азначыўся ўжо ў новым стагоддзі. У Брэсце браты Мяшковы ў памяць пра бацьку, вядомага трэнера Анатоля Мяшкова, стварылі клуб, які неўзабаве пераняў у СКА статус флагмана. У Мінску за кошт адміністрацыйнага рэсурсу з'явілася яшчэ адна сіла — «Дынама». «Бела-блакітныя» атрымліваюць добры бюджэт, падпісваюць моцных легіянераў, здабываюць тытулы, збіраюць поўную «Мінск-Арэну» на еўракубкавай гульні з «Барселонай». Аднак адмінрэсурс не стаўся вечным, і дынамаўскі выбліск завяршыўся фінансавым крахам і расфарміраваннем у 2014 г. Кінуты сцяг лідара мясцовага гандбола зноў падабраў БГК імя Мяшкова, ён носіць яго і дагэтуль.

Нарэшце ажыла і зборная. У 2008 г. беларусы трапілі на першы за 13 гадоў топ-турнір — і фінішавалі 15-мі на чэмпіянаце Еўропы.

У 2009 г. зборную ўзначаліў Юрый Шаўцоў, яшчэ праз год у каманду вярнуўся Сяргей Рутэнка, на той момант самы дарагі гандбаліст свету. І справа хай не адразу, але пайшла. У 2013 г. беларусы зноў выйшлі на чэмпіянат свету (15 месца), пасля чаго пачалася серыя з шасці топ-турніраў запар. Тройчы запар каманда Шаўцова ўваходзіла ў дзясятку найлепшых у Еўропе. Ніводная з беларускіх зборных у гульнявых відах, за выключэннем хакея з яго спецыфічнай сістэмай планетарных форумаў, такімі поспехамі пахваліцца не можа. Праўда, адна мэта зборнай пакуль так і не скарылася — ніяк не атрымліваецца выйсці на Алімпіяду.


Фота www.ihf.info
Вадзім Гайдучэнка: адарвацца ад зямлі

Сталы ўдзел зборнай у чэмпіянатах свету і Еўропы павялічыў аддачу ад дзіцячых школ, і ў Беларусі зноў сталі запальвацца зоркі. Арцём Каралёк, Мікіта Вайлупаў, Вячаслаў Бохан, Вадзім Гайдучэнка і шматлікія іншыя прайшлі ўніверсітэты мінскага СКА, дзе набраліся досведу, і выраслі ў якасных выканаўцаў.

## Незвычайны мундыяль

Чэмпіянат свету – 2021 у Егіпце абяцаў стаць вельмі незвычайным турнірам. Пандэмія COVID-19 змяніла свет, людзей і, вядома, прафесійны спорт. І справа нават не ў саміх умовах правядзення турніру — да матчаў без гледачоў і пастаянным тэстам на каранавірус гандбалісты і заўзятары ўжо прывыклі. Справа ў падрыхтоўцы, якая ў зборнай Беларусі выйшла максімальна змазанай.

Пандэмія не проста зблытала планы — яна іх сарвала. Зборная амаль на год засталася без гульнявой практыкі. Таварыскія турніры, на якія беларусы збіраліся, адмянілі. У распараджэнні Шаўцова засталіся толькі трэніровачныя зборы на радзіме і два матчы кваліфікацыі ўжо наступнага чэмпіянату Еўропы з нарвежцамі.

Беларусам давялося гуляць у Егіпце фактычна з ліста. Таму Шаўцоў быў асцярожны ў прагнозах і заявіў: ніякіх задач перад камандай на турніры штаб не ставіць. Імаверна, настаўнік хітраваў. Прынамсі адна задача стаяла: выйсці ў асноўны раўнд. У ЧС упершыню ў гісторыі ўдзельнічалі 32 зборныя. З-за пандэміі турнір пачаў губляць удзельнікаў перад самым стартам: адмовіліся зборныя Чэхіі і ЗША, але іх замянілі каманды Паўночнай Македоніі і Швейцарыі з прадбачліва створанага пула запасных. А ўжо па ходзе турніру непрыемнасці нагналі экзатычных дэбютантаў з Каба-Вердэ — афрыканцы атрымалі шмат тэхнічных параз.

Беларусы патрапілі ў групу з камандамі Славеніі, Паўднёвай Карэі і Федэрацыі гандбола Расіі — так звалася зборная ўсходніх суседзяў, якім праз знакамітыя допінгавыя грахі на два гады забаранілі выступаць пад сваім сцягам на ўсіх топавых спаборніцтвах па ўсіх відах спорту.

Задачу прабіцца ў наступны раўнд беларусы выканалі, хай і не без нюансаў. У першым матчы згулялі ўнічыю з расіянамі (32:32), у другім упэўнена разабраліся з паўднёвакарэйцамі (32:24), у трэцім, праўда, саступілі фаварытам групы славенцам (25:29), але гэта ні на што не паўплывала.

А потым быў асноўны раўнд, дзе, каб трапіць у чвэрцьфінал, трэба было аказацца адной з дзвюх лепшых каманд у групе. І зноў шанцы былі. У матчы са шведамі вучні Шаўцова вялі восем мячоў у першым тайме! Але ў выніку ледзве выратавалі нічыю на апошняй секундзе (26:26). Праз дзень, прытаміўшыся напярэдадні, беларусы патрапілі пад егіпецкі каток (26:35), а ў заключным туры выйгралі ў Паўночнай Македоніі права не быць апошнімі ў пуле (30:26). Толькі 17-е выніковае месца і выснова галоўнага трэнера: мы былі здольныя на большае.

## «Прыеду ў зборную, а мяне пасадзяць на 15 сутак?»

Дзень 9 жніўня падзяліў на «да» і «пасля» не толькі гісторыю Беларусі. Тэктанічныя разломы прайшлі па ўсіх сферах нашага жыцця. І, як вядома, не абмінулі вялікі спорт.

Гандбол не стаў выключэннем. І сярод гульцоў зборнай знайшліся тыя, хто вырашыў не маўчаць. Лідар зборнай Беларусі, адзін з лепшых лінейных свету, гандбаліст польскага «Віве» Арцём Каралёк выказаўся супраць гвалту ўжо ў жніўні. Ён асудзіў жорсткасць з боку сілавікоў, падтрымаў Аляксандру Раманоўскую і выступіў за правядзенне сумленных выбараў. А яшчэ апублікаваў фота з нацыянальным бел-чырвона-белым сцягам у падтрымку беларусаў. «Для мяне гонар — выступаць за краіну, народ і па магчымасці выйграваць. [...] я ўсё раблю адкрыта, выклаў фота ў падтрымку. Мне не страшна. Вядома, гэта будзе дзіўна, калі я прыеду ў зборную і мяне пасадзяць на пятнаццаць сутак. Але калі здарыцца так, я не здзіўлюся», — казаў Каралёк у інтэрв'ю «Прэсболу».

Выказаў салідарнасць з народам і іншы «зборнік», плэймэйкер французскага «Сэн-Рафаэля» Вадзім Гайдучэнка. Ліст супраць гвалту і за сумленныя выбары падпісалі экс-гульцы нацыянальнай каманды Дзяніс Рутэнка, Міхась Няжура, Антон Пракапеня. Уладзіслаў Кулеш, Аляксандр Бушкоў, Аляксей Хадкевіч і Артур Карвацкі разам з беларускімі гандбалісткамі запісалі зварот да сілавікоў, у якім заклікалі спыніць гвалт. А сталічны «Віцязь» не выйшаў на матч з «Машэкам» на знак пратэсту супраць затрымання Алены Леўчанка, за што быў зняты з чэмпіянату Беларусі.

Беларускай федэрацыяй гандбола амаль 15 гадоў кіруе Уладзімір Канаплёў — адзін з даўніх паплечнікаў Аляксандра Лукашэнкі. У Вярхоўным Савеце 13-га склікання ён кіраваў прапрэзідэнцкай фракцыяй, пасля быў старшынём Палаты прадстаўнікоў. У 2006 г. Канаплёў узначаліў БФГ, і далейшыя поспехі беларускага гандбола адмыслоўцы звязваюць у тым ліку з яго актыўнай дзейнасцю.

Не пайшоў супраць спартыўнага выніку Канаплёў і ў гэты раз. На чэмпіянат свету паехалі ўсе наймацнейшыя. Пра тое, каб не выклікаць важных выканаўцаў праз іх грамадзянскую пазіцыю, гаворкі не было.

# Наталля Петракова: жыць хочацца для Беларусі — новай, свабоднай, багатай

Сяргей ШЧУРКО

**Галоўная бяда беларускага жаночага гандбола ў тым, што ў ім перавяліся мужчыны. Тыя перспектыўныя жаніхі-альфонсы, якія нястомна перамяшчаліся са сваімі спартыўнымі жонкамі па розных гарадах блізкага і далёкага замежжа.**



Наталля Петракова з дачкой

Фота з сацсетак

Трэнеры савецкай загартоўкі чулі такіх за вярсту — дый гналі ад каманды, нібы ваўкоў са знакамітай песні Уладзіміра Высоцкага. Што, зрэшты, не перашкаджала апошнім вяртацца і вяршыць сваю няхітрую справу, расчароўваючы з часам спартыўных дзяўчынак да крайняй ступені.

У інтэрв'ю з лепшым брамнікам у гісторыі беларускага жаночага гандбола Наталляй Петраковай мы паспяваем абмеркаваць прорву тэм, але чамусьці менавіта гэтая западае ў душу. Напэўна, таму, што мая суразмоўніца мала нагадвае раздушаную лёсам ахвяру, якая пазбавілася працы ў нацыянальнай зборнай праз сваю высокую грамадзянскую пазіцыю.

За час нашай размовы я разумею, чаму калегі-трэнеры разглядаюць Петракову як нейкі музейны, не бачаны ў нашых месцах экспанат. Яна не плача, а жартуе і ўсміхаецца. І лёгка знаходзіць прычыну, чаму цяперашняе пакаленне айчынных брамнікаў не падобна на яе. На тую маладую Наташу, якая распачала легіянерскую кар'еру ўжо ў 19 гадоў, — і адразу ў топавых заходніх клубах.

***— Што змянілася ў тваім жыцці, калі Міністэрства спорту не падоўжыла з табой кантракт праз подпіс знакамітага ліста спартсменаў за сумленныя выбары і супраць гвалту?***

— Ды нічога, акрамя майго ўнутранага свету і пільнай увагі з боку кіраўніцтва і калег. Апошнія ставяцца, як да нейкага звера ў заапарку — яны мяне разглядаюць: «Ну як ты там, Жывая?». Некаторыя могуць скінуць эсэмэску або напісаць у вайберы з нагоды якога-небудзь майго паста: «Наташка, вау, крута!». Дзяўчаты са зборнай лайкаюць.

***— Гэта засмучае?***

— Ды не. Мы заўсёды былі толькі калегамі, звязанымі выключна прафесійнымі адносінамі. А цяпер ужо і іх няма, пасля таго як мяне пазбавілі пасады старшага трэнера. Засталася толькі праца метадыстам у Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі. Ну і плюс узяла гадзіны як дзіцячы трэнер — выжываць жа неяк трэба.

Праўда, мне не зусім зразумела, чаму дзіцячы трэнер у Мінску мае 700 рублёў, а ў Гомелі ў такой жа спартыўнай школе 1600. І гэта не выбух на макаронной фабрыцы, па сутнасці, гэта нармальная зарплата для трэнера, які мае шмат гадзін. Мне незразумела, чаму ў нас такая. Трэнер, які столькі зарабляе, аб чым будзе думаць? Аб дзецях, аб выніку?

***— А гандбол цяпер дзецям увогуле патрэбны?***

— Так, і гэта абсалютна дакладна. Бацькам трэба кудысьці іх аддаць, і спорт падыходзіць больш за ўсё. Павер, я ведаю дакладна, што дзеці ў школу не рвуцца. У нас у РЦАРы 608 дзяцей, і калі паставіць ім дылему, куды яны хочуць больш, то трэніроўка пераможа ў адны вароты.

***— Нармальны адказ для тых, хто хоча звязаць сваё будучае жыццё з гандболам. Але ці шмат такіх...***

— Не, вядома. Самы цікавы ўзрост у гэтым плане — 13–14 гадоў. Яны хочуць гуляць, у іх ёсць парывы. Дарослыя ўжо прагнуць стабільнасці. А наогул гэта пакаленне, канечне, не падобна на наша.

Я скажу: «О, нармальна!». Яны скажуць: «Норм». Я скажу: «Хорошо», у іх гэта будзе: «Хор».

***— А «плохо» — «плох»?***

— Яны проста вочы апусцяць і не будуць нічога каментаваць. Мне цяперашнія дзеці падабаюцца тым, што яны так хутка не перагараюць, як мы ў іх узросце. Эканомяць на эмоцыях і нешта пакідаюць у сабе. Правільна, няма чаго гарэць, каб у 18 гадоў адчуваць сябе ў спорце бабуляй.

У той жа час ёсць момант недапрацоўкі. Але, думаю, гэта віна трэнера. Яны не хочуць выцягваць з іх жаданне і парывы да перамогі. Людзі прыходзяць адбыць свой час. А што яшчэ можна рабіць за 700 рублёў?

***— А калі плаціць ім 1700, імкненні намалююцца?***

— Тады перад дзвярыма цэнтра ў адзін момант утворыцца чарга з выпускнікоў універсітэта фізкультуры. І ўжо ніхто не захоча адбываць час. Магчыма, і са СКА пабягуць да нас. Так, гэта гучыць банальна, але зарплата заўсёды служыла добрай матывацыяй.

***— У першую чаргу, гэта тычыцца спартсменаў. Спорт, як вядома, заўсёды быў някепскім сацыяльным ліфтам.***

— Для многіх схема ўжо адпрацаваная. Школа — спартыўны клас — БДУФК, падчас якога добра было б дзесьці перакантавацца. У лепшым выпадку гэта была б лаўка запасных БНТУ, «Гомеля» ці «Бярэсця». І ўсё, жыццё склалася. Да 24 гадоў план ёсць. І, калі задумацца, гэта класная штука.

Таму што я ў свае 18 паняцця не мела, дзе апынуся заўтра. Іншая справа, што такая мернасць мала спрыяе разуменню таго, што свае шанцы ў спорце трэба выгрызаць. Беларуская ментальнасць? Не ведаю, можа быць.

**Вось яны цяпер сядзелі б побач з намі — той жа Барбашынскі або Рутэнка — і казалі б, маўляў, рабяты, ну зразумела, што ўсё гэта хранова; але ж і вы зразумейце, у мяне сям'я, бізнес...**

Я з'ехала ў Нарвегію ў 19, мне хацелася нешта памяняць. Ці хочуць дзяўчаты цяпер што-небудзь мяняць? Пытанне... Часта пытаюся: «Чаму ніхто з нашых дзяўчат-варатароў не з'едзе ў той жа венгерскі чэмпіянат — вельмі добры па сваім узроўні, дзе можна павышаць прафесійны ўзровень?».

***— Напэўна, у беларускім чэмпіянаце прыстойна плацяць.***

— Аб заробках цяжка казаць, але, думаю, што 1500 долараў у лепшых галкіпераў набягае. Але ў Венгрыі было б 2500 мінімум. Ну чым не стымул?

***— Эх, перавяліся ў нас мужы-альфонсы — абавязковы спадарожнік усіх жаночых каманд былога СССР. Ужо яны б змаглі ўгаварыць сваю другую палову зрабіць гэты рашучы крок наперад.***

— Гэта так, павіс бы на шыі і ўгаварыў — арыфметыка ж простая. Але дзе яны цяпер? (Усміхаецца). Пахаваліся, напэўна, як і ўсе астатнія, за жаночымі спінамі. Чакаюць пераменаў.

***— Чую ў тваіх словах папрок усім беларускім мужчынам.***

— Нядаўна пракаментавала адзін пост у «Фэйсбуку» пра тое, што Саша Герасіменя дамаглася адмены чэмпіянату свету па хакеі. Так, дзяўчына ўзялася рабіць глабальную працу мужчын, якія памылі рукі. Напісала: «Паважаныя мужчыны, адпраўце нас усіх на адпачынак, у СПА, ды нават у вёску — і зрабіце хоць што-небудзь самі». Адказу, дарэчы, не атрымала. Толькі некалькі жаночых лайкаў.

Хоць, вядома, калі Данія не хоча ехаць да нас на хакейны чэмпіянат, то Саша тут ні пры чым. Проста яны не хочуць гуляць на Акрэсціна.

***— А мне здаецца, што спартсменам збольшага ўсё роўна.***

— Усё не так. Я ўспамінаю датчан — тых жа гандбалістаў, дык яны заўсёды чуйна рэагавалі на ўсякія штукі, якія адбываюцца ў свеце. У іх няма такога, што мы працiснемся дзе-небудзь у чырвоным калідорчыку, а на ўсё астатняе нам напляваць.

***— У нашых спартсменаў такія якасці ў дэфіцыце. Славутыя чэмпіёны ўзначалілі хіт-парад падпісантаў праўладнага ліста.***

— Мяне гэта ніколькі не здзівіла. Людзі атрымліваюць пэўныя прэферэнцыі і задаволеныя тым, што ёсць. Хоць, на мой погляд, ніякія грошы не каштуюць хоць бы аднаго збітага чалавека. Зноў жа, усе супраць гвалту, і нават тыя, хто падпісаўся пад другім лістом, думаюць на гэты конт адназначна. Вось яны цяпер сядзелі б побач з намі — той жа Барбашынскі або Рутэнка — і казалі б, маўляў, рабяты, ну зразумела, што ўсё гэта хранова; але ж і вы зразумейце, у мяне сям'я, бізнес...

***— Ты зараз заўзела за нашу мужчынскую зборную на чэмпіянаце свету?***

— Больш за ўсё Шаўцова лаялі за тое, што каманда ехала ў Егіпет без выразнай мэты. Той, якой хацелі б дасягнуць. Хоць ён, хітрая ліса, заўсёды ведае, што трэба сказаць. Што-небудзь тыпу падрыхтоўкі новага пакалення — каторага там па ліку, якое павінна будзе абавязкова стрэліць. Толькі ніхто не ведае, калі гэта адбудзецца дакладна. Таму крэдыт даверу трэнеру трэба падоўжыць зноў.

Мне ж здалося, што мы прыехалі туды не на чэмпіянат свету, а на вакацыі. Падчас перапынкаў у гульнях наш галоўны трэнер асабліва і не распінаўся. Мабыць, не хацеў парушаць сардэчны рытм. Хоць на іншых лаўках эмоцыі білі ключом.

Ну што нам перашкодзіла выйграць у славенцаў? У другім тайме каманда стаяла як укапаная. Можа, тады і трэба было прывесці яе ў пачуццё эмоцыямі, даць ёй неабходны энергетычны зарад?

Параўноўваю нашу жаночую зборную з мужчынскай і разумею, што пры прыкладна аднолькавых выніках мы падвяргаліся куды больш жорсткай крытыцы.

***— А калісьці вы перамагалі цяперашніх чэмпіёнак свету галандак, прычым без асаблівага напружання. Атрымліваецца, праціўнікі зрабілі крок, а то і два наперад, а мы засталіся на месцы?***

— Бяда ў тым, што ў нас няма масавага спорту, як у Даніі, Славеніі або Нарвегіі. У нас у нацыянальным дзіцячым турніры «Ваверка» ўдзельнічаюць

пяць каманд дзяўчынак, тры з якіх — з Мінска. Так, пандэмія, але пяць — гэта нікчэмна мала!

Вярніце назад масавы спорт, які быў у СССР. Мы цяпер працуем кропкава, эксклюзіўна. Убачылі здольнага хлопца — і паперлі яго гадаваць. Паклалі на яго груз абавязкаў і ўзялі слова, што ён абавязкова стане вялікім гульцом.

Калісьці толькі ў Гомельскім раёне Сельмаш у гандбол гулялі ў пяці школах. Настаўнікі фізкультуры выкладалі адразу некалькі гульнявых відаў, і дзіця яшчэ ў школе магло зразумець, дзе ў яго атрымліваецца лепш. А дакладней за ўсё, той жа настаўнік сам рэкамендаваў яго дзіцячаму трэнеру.

Сёння я пытаюся ў дачкі: «Чым вы займаецеся на фізкультуры? ». Кажа: «Мы вельмі просім пагуляць у валейбол!». Вядома, бо ў залі ёсць толькі сетка — вароты адсутнічаюць. Але нават у гэтым задавальненні ім адмаўляюць, таму што дзіця можа атрымаць траўму. А каму хочацца адказваць? Давайце лепш прэс пакачаем або ў даўжыню паскачам.

***— Няма таго энтузіязму.***

— Так, няма ідэі. Здаровы лад жыцця павінен пачынацца яшчэ з дзіцячага садка. Абавязкова мусіць быць заняткі фізкультурай, абавязкова на вуліцы. І там трэба не стаяць, уткнуўшыся ў тэлефон, а працаваць з дзецьмі. Цяпер вельмі папулярнае практыкаванне — «Дзеці, давайце паходзім!». Вельмі зручна — мінімальны траўматызм.

А потым мы глядзім на скандынаўскіх хлопчыкаў і дзяўчынак і думаем: а чаго ж гэта яны такія здаровыя і каардынаваныя? А ў іх яшчэ з садка дзеці ўжо знаёмыя з элементамі таго ж гандбола. Маленькія вароты, маленькі мяч, гульнявая атмасфера... І як вынік — масавы ахоп.

Мне, дарэчы, заўсёды было цікава развіць гэтую тэму і ў нас у краіне. Іншая справа, што раней на тое элементарна не хапала часу, а цяпер, мусіць, ён з'явіўся.

Ведаеш, калі пачалася ўся гэтая гісторыя са звальненнем са зборнай, то нават незнаёмыя людзі мне пісалі: «Наташа, вы без працы не застанецеся». І я думаю, што яны мелі рацыю, бо не ўяўляю сябе чалавекам, які сядзіць склаўшы рукі.

Хоць не буду хаваць: часам нахлынае дэпрэсія. Я ўжо гадоў дзесяць не гляджу тэлевізар, але калі адкрываеш інтэрнэт, чытаеш пра тое, што адбываецца... Думкі з'яўляюцца розныя. Самая першая і найбольш перспектыўная — з'ехаць адсюль куды далей. Туды, дзе можна жыць у нармальнай спакойнай абстаноўцы, не баючыся выходзіць на вуліцу, не баяцца за сваю дачку, бо сёння не вярнуцца дадому можа кожны.

Калі чытаеш пра тое, што ў нас рыхтуюцца канцлагеры, то рабіць наогул нічога не хочацца. І звязваць сваю будучыню з такой краінай таксама неяк не цягне. Прыходзіш на працу і выконваеш нейкія функцыі, нібы аўтамат. Робіш добра, бо я не ўмею працаваць дрэнна. Але стварыць нешта новае...

Вось гэта дылема, з якой я змагаюся, і якую, ведаю, перажываюць многія і многія мае суайчыннікі. Жыць хочацца для Беларусі — новай, свабоднай і багатай. Той, якой яна можа стаць. Але не для той, якая яна цяпер. Я сёння тут задыхаюся. Гэта шчыра.

***— А што твая дачка, лаўрэат музычных конкурсаў?***

— Вучоба ёй ужо не вельмі цікавая. Дзяўчаты могуць быць трохі падфарбаваныя, з прычоскай — і пачуць у свой бок ад выхавацеля гімназіі: «Вы што, збіраецеся толькі мордамі гандляваць?». Ну вось што гэта? Яны ж не ішлі з півам у руках, не калупаліся ў носе падчас урока. Ну навялі стрэлкі — у гэтым ёсць нешта заганнае для ўжо амаль дарослых дзяўчат?..

Да музыкі ў Жэні ўжо няма таго імпэту — як і ў нашых дзяўчат да гандбола. Настаўнікі, трэнеры ўмеюць у нас адбіваць жаданне. Трэба старацца прыцягваць дзіця. Каб яно, адкрываючы гэты свет, адкрыла нешта і ў сабе. Я кажу настаўнікам: мой час быў з 6 да 11 гадоў, далей — ваш. Зацікавіць чалавека, захапіць. Не ведаю чым, я не спецыяліст у гэтай галіне. Можа, нью-ёркскім джаз-бэндам. Я, напрыклад, заўсёды кажу маладым гульцам: «Дзяўчаткі, ваша будучыня залежыць выключна ад вас. Калі вы хочаце дабіцца ў жыцці многага, то павінны працаваць, працаваць і яшчэ раз працаваць, не адцягваючыся ні на што старонняе. Стаўце мэту і ідзіце да яе».

***— Бярыце прыклад з вашага трэнера.***

— Разумееш, у кожнага свой характар. Я, напрыклад, калі мне хтосьці не падабаўся, проста сыходзіла ад гэтых людзей, не хацела з імі працаваць. Мяне абзывалі ўсялякімі словамі, але я не мела ніякіх згрызот сумлення. Я проста не магу працаваць там, дзе не адчуваю сябе камфортна, дзе да мяне не ставяцца як да нармальнага чалавека.

Жэньцы складаней, яна ж не можа так проста развярнуцца і сысці з вучылішча. Ну і трэба разумець, што нашых дзяцей таксама змянілі гэтыя падзеі. Яна мне задае пытанне: «І доўга ты тут збіраешся заставацца?». І што мне ёй адказаць?




Фота «Прэсбол»

...у часы гульнявой кар'еры



Фота «Прэсбол»

...падчас трэніроўкі

***— Падчас кар'еры ты магла застацца ў той жа Нарвегіі — краіне выдатнай з любога пункта гледжання.***

— Калі я хацела вярнуцца ў гандбол пасля нараджэння Жэнькі, то ўжо нікому не была патрэбная. Ну а як, з маім мікраінсультам.

Цяжка сыходзіць з вялікага спорту, калі ў цябе на руках кантракт з найлепшым клубам свету — аўстрыйскім «Хіпабанкам». Калі ёсць альтэрнатыва — з'ехаць у цёплую Іспанію. Калі нескладана вярнуцца і да скандынаўскага вектару.

30 гадоў для брамніка гэта не ўзрост. Але... З такім дыягназам мяне потым не ўзялі нават у мінскі БНТУ: «Наташка, прабач...»

Калі малады, то проста ездзіш па краінах і думаеш, дзе табе было б цікава жыць. Тая ж Нарвегія для мяне была занадта змрочная. Залішне моцны там традыцыйны ўклад жыцця. У лістападзе яны ўсёй краінай сталі на лыжы — у сакавіку з іх сышлі. Калі адпачынак у камандзе доўжыцца 20 дзён, то 12 з іх яны абавязкова павінны правесці, раніцай прабягаючы кросік, а ўвечары збіраючыся кампаніяй папіць чаю ці пайсці ў бар.

Ну навошта гэта трэба? Ну развітайцеся вы на гэтыя тры тыдні. Таму што за год ужо так наядаешся зносінамі адна з адной, што ад гэтага элементарна хочацца адпачыць. А вось яны не наядаліся. Для нарвежак жаночая супольнасць вышэй за ўсё.

«Наташа, ну гэта ж так выдатна — умацоўваць камандны дух і ў адпачынку. Пайшлі з намі пап'ём чаёчку...» А мяне гэта злавала, бо па натуры я адзіночка. Адпрацавала — і мне трэба дадому. Нікога не бачыць і не чуць. А яны расстацца не могуць. Патрэніраваліся, то давайце пойдзем паабедаем усе разам, а потым яшчэ куды-небудзь сходзім. Ну вось як іх не ванітуе адна ад адной?

Харватыя мне падабалася. Добрая краіна, я яе разглядала для далейшага жыцця. Але ўсё ж яна занадта шумная, бясконца крыкі. Затое яны яркія і эмацыйныя на гульнявой пляцоўцы — у гэтым іх велізарны плюс.

Датчане класныя, яны не падобныя да нарвегаў. У іх культ дома, і яны заўсёды настроены пазітыўна. Нельга хвалявацца, патрэбна заўсёды ўсміхацца. Калі ў цябе нешта здарылася, то зусім не абавязкова цягнуць гэта ў каманду. Навошта хваляваць сяброўак, хай гэта застанецца ўнутры. Мы табе што дрэннага зрабілі, каб ты сваёй пахмурнай фізіяноміяй псавала ўсім настрой? На людзях ты павінна быць вясёлай і жыццярадаснай.

Яшчэ спадабалася Аўстрыя. Збіралася пагуляць у «Хіпабанку» гады тры, а потым можна было б там застацца. Але бачыш, выношваеш планы яшчэ з 13 гадоў і быццам бы ўсё робіш для гэтага... Мне сябе няма ў чым папракнуць, але жыццё ўносіць свае карэктывы. Усё ж такі вялікі спорт патрабуе ахвяр.

А цяпер кудысьці з'ехаць практычна нерэальна. Каранавірус, беспрацоўе, ды і каму ў той жа Даніі аддаць перавагу — мясцоваму трэнеру або спецыялісту з краіны, якая не з'яўляецца членам ЕС? Навошта людзям патрэбны гэты галаўны боль?

Не ведаю, можа, памяняць прафесію... Хоць разумам усведамляю, што працаваць з тымі ж маленькімі дзеткамі ў садку — гэта маё. Не чысты спорт, а фізкультура, хоць, па вялікім рахунку, нават у такім узросце бачныя задаткі дзяцей. І даць ім правільны кірунак — гэта задача, над якой хацелася б папрацаваць.

І ўсміхацца бацькам. І хваліць дзяцей, бо ў гэтым далікатным узросце яны асабліва ўспрымальныя да хвалы і падвышанай увагі да сябе.

***— Працаваць па дацкай сістэме?***

— Ну так. А што ў мяне ўнутры... Думаю, як і ў кожнага нармальнага беларуса. Аднак навошта нам уголас казаць аб тым, што і так кожны з нас ведае? Лепш будзем усміхацца. На злосць тым, хто хацеў бы бачыць слёзы ў нашых вачах.




Фота «Прэсбол»

...з вядомым спартыўным журналістам Сяргеем Новікавым

# Фізкульт-пратэст: сусветны спорт

Аляксей АСАНОВІЧ

**Спорт ніколі не быў «па-за палітыкай». Яшчэ ў 1906 г. на пазачарговай Алімпіядзе ірландскі прыгун Пітэр О'Конар на цырымоніі ўручэння яму медалёў падбег да флагштока, дзе вісеў флаг Вялікабрытаніі, ускараскаўся наверх і пачаў махаць ірландскім сцягам. На той момант Ірландыя была часткай Брытаніі, але ў тым ліку і смелы ўчынак Пітэра дапамог наблізіць незалежнасць Ізумруднага вострава.**

Моцны адказ часткі беларускіх спартоўцаў на неадэкватнасць улады паставіў Алену Леўчанка, Аляксандру Раманоўскую і кампанію ў шэраг легенд сусветнага спорту, для якіх пакуты суайчыннікаў — не пусты гук. «Новы час» прадстаўляе зборную ўсіх часоў з тых, хто не маўчаў.

## Махамед АЛІ: «Проста забярыце мяне ў турму»

Галоўны баксёр ХХ стагоддзя выйграў Алімпіяду – 1960 у Рыме і званне чэмпіёна свету ў прэстыжнай версіі. Але над бліскучай кар'ерай навіс пытальнік, калі Алі пачаў гучна выказвацца супраць вайны ў В'етнаме: «Маё сумленне не дазваляе мне страляць у свайго брата... За што? В'етнамцы ніколі не называлі мяне "нігер", ніколі не лінчавалі, не спускалі на мяне сабак, не забіралі ў мяне грамадзянства, не гвалтавалі і забівалі маіх маці і бацьку... Як я магу страляць у бедных людзей?».

Калі Махамеду прыйшла павестка ў В'етнам, ён адмовіўся служыць у войску ЗША. Але і з'язджаць у Канаду, як у той час рабілі многія пацыфісты, не стаў. «Проста забярыце мяне ў турму», — сказаў ён. Прысуд быў жорсткім: пяць гадоў зняволення. Фактычна за кратамі баксёр быў не так доўга — пачаліся апеляцыі. Але з 25 да 29 гадоў — у залатым узросце — Алі не выходзіў на рынг. Замест гэтага ён шмат вандраваў, выступаў у каледжах па ўсёй Амерыцы, заклікаючы да спынення вайны, расавай няроўнасці і вучыў афраамерыканцаў ганарыцца сваім паходжаннем.

У прафесійны спорт ён не проста вярнуўся, а зноў стаў лепшым у свеце. Цяпер у гонар Алі называюць вуліцы.

## Томі СМІТ і Джон КАРЛАС: рукі ў чорных пальчатках

Для спрынтараў з ЗША фінал спаборніцтваў на 200 метраў на Гульнях – 1968 у Мехіка прайшоў выдатна. Сміт з сусветным рэкордам выйграў забег, Карлас фінішаваў трэцім. Але на цырымоніі здарылася непрадказальнае: амерыканцы падняліся на п'едэстал басаног, а падчас амерыканскага гімна паднялі дагары рукі ў чорных пальчатках. Так спартоўцы жадалі прыцягнуць увагу сваёй дзяржавы да сацыяльных праблем у ЗША. «Калі я выйграю, то я амерыканец, а не афраамерыканец. Але калі я раблю нешта дрэннае, я негр...» — успамінаў Сміт.

Пасля таго, як спартсмены вярнуліся ў Штаты, на іх абрынулася лавіна нянавісці — ім нават пагражалі смерцю. «Злей, жудасней, пачварней», — пісаў пра іх учынак Time Magazine. «Ганебны, дзіцячы, нудны», — дадаваў Chicago American. Дарэчы, аўстраліец Пітэр Норман, які прыйшоў у тым забегу другім, выразіў салідарнасць са Смітам і Карласам. У Аўстраліі гэтага не ацанілі: у Мюнхен – 1972 яго не пусцілі, хаця кваліфікацыйны нарматыў ён выканаў некалькі разоў.

У 2016 г. у Нацыянальным музеі афраамерыканскай культуры ў Вашынгтоне з'явілася скульптура з тым самым Black Power Salute. А аўстралійскія ўлады афіцыйна папрасілі прабачэння ў Нормана ў 2012 г. — праз шэсць гадоў пасля яго смерці. Black Power Salute быў паўтораны амерыканцамі Вінсэнтам Мэцьюзам і Уэйнам Колетам у Мюнхене – 1972. Абодва адразу атрымалі бан на ўсё жыццё. ЗША вымушаны былі з-за гэтага зняцца з эстафеты 4 па 400: ім проста не хапіла спартсменаў.



Томі Сміт і Джон Карлас: жэсты свабоды

## ЛеБрон ДЖЭЙМС: «Я ніколі не сяду з ім побач»

Найлепшы (па меркаванні шматлікіх фанатаў і яго ўласным) баскетбаліст сучаснасці — бадай, самы сістэмны барацьбіт супраць трампізму ва ўсіх яго праявах. «Лэйкерз» Джэймса нават пачалі байкот плэй-офф НБА – 2020 у знак пратэсту супраць паводзін паліцыі ў адносінах да Джэйкаба Блэйка (29-гадовага афраамерыканца, сур'ёзна параненага ў Вісконсіне). Па інфармацыі ESPN, толькі Барак Абама здолеў дамовіцца з гульцамі не пачынаць байкоту.




ЛеБрон Джэймс: супраць Трампа

ЛеБрон не раз рэзаўся з Трампам на яго пляцоўцы — у «Твітары». Гэта Джэймс прышпіліў да прэзідэнта ЗША слова bum — «лайдак, абібок». «Трамп падзяляе краіну спортам, хаця спорт заўсёды аб'ядноўваў людзей, а не наадварот! Я ніколі не сяду з ім побач!» — казаў ЛеБрон у інтэрв'ю CNN. Трамп вельмі злаваўся, але што зробіш па законе з такім змагаром?

У 2018 г. Дональд адмяніў запрашэнне для клуба па амерыканскім футболе «Філадэльфія Іглз» наведаць Белы дом пасля перамогі ў Супербоўле. Прычына: гульцы «арлоў» дэманстратыўна выказалі нязгоду з палітыкай ЗША і станавіліся на калена падчас гімна. ЛеБрон хутка адказаў: «Ні мы, "Клііўленд Кавальерз", ні "Голдэн Стэйт Уорыарз" не пойдзем у Белы дом пасля плэй-офф». Так і здарылася.

Але не задаволены амерыканскія спартсмены не толькі Трампам. Галкіпер «Бостан Бруінз» Цім Томас адмовіўся наведаць Белы дом падчас прэзідэнскага тэрміну Барака Абамы. «Лічу, што федэральная ўлада выйшла з-пад кантролю і пагражае правам і свабодам людзей. Гэта робіцца на выканаўчым, заканадаўчым і юрыдычным узроўнях», — заявіў Томас. І яму за гэта нічога не было.

## Маціас ШЫНДЭЛАРЖ не прыняў захоп Радзімы

Ураджэнец маравійскага мястэчка Козлаў быў мегазоркай знакамітай аўстрыйскай зборнай міжваеннага перыяду, якую называлі «вундэрцім» — «каманда-цуд». Нападаючы быў лідарам таго калектыву. Як і многія аўстрыякі, ён не прыняў захоп радзімы фашыстамі.

3 красавіка 1938 г. у Вене была згуляна так званая «Аншлюсшпіль» — гульня, якая павінна была ўрачыста адзначыць далучэнне Аўстрыі да Трэцяга рэйху. Гаспадары выйшлі на поле не ў традыцыйнай чорна-белай форме, а ў чырвона-бела-чырвоным — колерах аўстрыйскага сцяга. Шындэларж адмовіўся зігаваць у гонар акупантаў, аўстрыйцы «адвазілі рылам» гасцей, стварыўшы неймаверную колькасць галявых момантаў, хаця забілі толькі двойчы. «Вундэрцім» адабралася на чэмпіянат свету – 1938, але пасля Аншлюсу ехаць туды павінна была ўжо аб'яднаная каманда Трэцяга рэйху.

Шындэларж не пажадаў гуляць ні за якую зборную, акрамя сваёй, і застаўся дома. Неўзабаве ён загінуў, атруціўшыся ўгарным газам. Па адной з версій, гэта было забойства: за кавярняй, якая належала Маціасу, сачыла гестапа...

## Зборная Нацыянальнага вызваленчага фронту Алжыра

Большая частка гэтай незвычайнай каманды да 1958 г. жыла топ-жыццём сур'ёзных футбольных прафесіяналаў. Дастаткова сказаць, што адразу пяцёра выступалі за «Манака», былі таксама прадстаўнікі «Ліёна», «Марсэля», «Бардо». У некаторых нават быў пэўны найгрыш за зборную Францыі, магчымасць ехаць з ёю на першынство свету – 1958. Але алжырцы вырашылі інакш — і таемна збеглі на радзіму, дзе ішла сапраўдная вайна за незалежнасць супраць французскіх войск.

З'яднаўшыся ў зборную Нацыянальнага вызваленчага фронту, яны за чатыры гады правялі нямала матчаў па ўсім свеце, расказваючы пра барацьбу алжырскага народа за незалежнасць. У афіцыйных турнірах каманда ўдзельнічаць не магла, але згуляла каля 80 «таварнякоў», з якіх выйграла 55. За атакуючы стыль яе асабліва любілі аматары футбола. У 1963 г. каманда НВФ перастала існаваць, але па святочнай



Махамед Алі: не вайне



Маціас Шындэларж: аншлюс не пройдзе

# ніколі не быў па-за палітыкай




Алжырскія футбалісты: гуляць толькі за Радзіму

прычыне: на яе месца прыйшла зборная незалежнага Алжыра — прызнаная і легітымная.

## Званімір БОБАН уступіў у бойку з паліцыяй

13 траўня 1990 г. — неафіцыйны пачатак вайны ў Югаславіі. На стадыёне «Максімір» у Загрэбе гулялі мясцовае «Дынама» і белградская «Црвена Звезда» — харваты супраць сербаў. Ужо на 10-й хвіліне пачалася сапраўдная бойка. Харвацкія «ультрас» рынуліся на поле. Іх пачалі сустракаць паліцэйскія — вядома, з дручкамі. Паўабаронца гаспадароў Званімір Бобан не спужаўся паліцы і ўступіў у бойку. Яго хай-кік «амапаўцу» цяпер многія называюць стартавым свісткам балканскіх войн за незалежнасць.

Бобану на той момант было ўсяго 22 гады. Ён ужо даўно падаваў надзеі і нават згуляў 7 матчаў за зборную Югаславіі. Потым ён пераедзе ў Італію, на 10 год стане сімвалам знакамітага «Мілана», з якім выйграе Лігу чэмпіёнаў. А ў 1998 г. Званімір з партнёрамі па зборнай даб'ецца выдатнага выніку — трэцяга месца на чэмпіянаце свету ў Францыі. Менавіта так сенсацыйна на мундыялях дэбютавала незалежная Харватыя.

## САКРАТЭС: «Так — любові, не — тэрору»

Бразільскую футбольную зорку 1980-х гг. паважалі настолькі, што да імя часцяком




Доктар Сакратэс: галоўны гуманіст сусветнага футбола

дадавалі слова Доктар. Медыцынскі дыплом у яго і сапраўды быў — пасля кар'еры ён нават працаваў у шпіталі. Аднак у гісторыю паўабаронца ўвайшоў перш за ўсё як галоўны гуманіст сусветнага футбола.

Ён паспрабаваў немагчымае: выцягнуць Бразілію, захраслую ў кірзачах ваеннай хунты, да дэмакратыі. Сакратэс прызываў суайчыннікаў да барацьбы за свае правы, заахвочваў да грамадскай актыўнасці і ўзаемнай дапамогі. Ён выходзіў на поле з павязкай на галаве са словамі: «Так — любові, не — тэрору». Найвышэйшай кропкай яго імкнення да агульных правоў чалавека стаў перыяд, які атрымаў назву Дэмакратыя «Карынціянса». У першы і, бадай, апошні раз у прафесійным клубе працавала прамое галасаванне: гульцы, трэнеры, масажысты, адміністратары разам вырашалі, колькі і калі трэніравацца, як гуляць, як адпачываць... Сакратэс пераканаў уладальніка клуба Валдэмара Пірэса, што так будзе лепш.

«Карынціанс» двойчы выйграў чэмпіянат штата Сан-Паўлу, а ў 1982 г. гульцы выйшлі на поле ў цішотках з надпісам «Галасуй 15-га», заклікаючы людзей узяць удзел у першых з перавароту 1964 г. шматпартыйных выбарах у Бразіліі. Чэмпіянат Сан-Паўлу – 1982 «Карынціянс» выйграў з надпісам «Дэмакратыя» на майках. «Гэта самая вялікая каманда з тых, дзе я гуляў. Таму што гэта больш, чым спорт. Мае палітычныя перамогі больш важныя для мяне, чым футбольныя. Гульня заканчваецца праз 90 хвілін. А жыццё працягваецца», — казаў Сакратэс.

У 1984 г. ён падчас палітычных дэбатаў выступіў перад аўдыторыяй агульнай колькасцю 1,5 млн чалавек. Уладзе такое свавольства, канечне, было не даспадобы. Прэзідэнт бразільскай футбольнай канфедэрацыі — брыгадны генерал Жэраніма Бастас — запатрабаваў ад клуба заставацца па-за палітыкай. Але цяжка пераацаніць важнасць таго «Карынціянса» ў працэсе дэмакратызацыі Бразіліі. «Перамога ці параза, але заўсёды з дэмакратыяй», — дэвіз вялікага гульца да самай смерці ў 2011 г.

## АЛЕГЕР Прэсас адмовіўся выступаць за зборную Іспаніі

Футбаліст быў абаронцам не толькі «Барселоны» і «Аякса», але і каталонскай незалежнасці. Ён нават адмовіўся выступаць за зборную Іспаніі, але гэтага яму было мала. Алегер рэгулярна выступаў у СМІ супраць іспанскіх уладаў, патрабуючы права Каталоніі на самавызначэнне. У 2007 г. ён напісаў артыкул для баскамоўнай газеты Berria, дзе ўзняў пытанні незалежнасці суда ў Іспаніі на прыкладзе члена тэрарыстычнай групоўкі ЭТА Іньякі де Хуана, які ў той час аб'явіў галадоўку ў турме ў знак пратэсту.

З-за артыкула кампанія Kelme разарвала з Алегерам кантракт. На іспанскіх стадыёнах яго пачалі абсвістваць, але спартовец не здаўся: «Тое, што адбываецца са мной, — гэта нішто ў параўнанні з пакутамі, праз якія праходзяць некаторыя людзі. Мне толькі сумна, што не ўсе нават прачыталі артыкул. Хацелася б, каб людзі ўсё зразумелі і спрачаліся па сутнасці, але гэтага не адбываецца», — казаў футбаліст.



Артур Эш: дэмакратыя патрабуе ахвяры

У 2010 г. пасля трансферу ў «Аякс» Алегер узяў удзел і ў пратэстах супраць забароны сквоцінга ў Нідэрландах. Дарэчы, у амстэрдамскім клубе нармальна прынялі актыўную пазіцыю гульца, бо пратэст быў мірным.

## Артур ЭШ ненавідзеў апартэід

Адзіны цемнаскуры тэнісіст, які выйграў і «Уімблдон», і «Аўстраліян Оўпэн», і «ЮС Оўпэн», біўся за перамогі не толькі на корце, хаця і яго трыумф у Мельбурне ў 1970 г. нарабіў шмат шухеру. Чэмпіён узяў тытул, толькі звольніўшыся з арміі ЗША, дзе даслужыўся да лейтэнанта. Правы чалавека і сапраўдная дэмакратыя былі для яго галоўнай мэтай, тым больш што ў той жа год здарыліся забойствы Марціна Лютэра Кінга і Роберта Кенэдзі.

Эш ненавідзеў апартэід ва ўсіх праявах. Шмат гадоў запар яму адмаўлялі ў візе ў ПАР, куды ён марыў адправіцца на турнір. У 1992 г., калі Эш быў ужо вельмі хворым чалавекам (ён атрымаў СНІД з-за трансфузіі крыві пасля адной за аперацый), ён не змог застацца ў баку ад дэманстрацыі ля Белага дома. Амерыка адмовілася прыняць бежанцаў з Гаіці, хаця да гэтага з радасцю дала прытулак кубінскім ахвярам рэжыму Кастра. Нават са слабым здароўем Эш адправіўся на дэманстрацыю, якія ў той час былі забаронены. Арышт не прымусіў доўга сябе чакаць, але з'яўленне тэнісіста ля Белага дома было важным знакам для ўсіх. Праз некалькі месяцаў Артур памёр.



Званімір Бобан: хай-кік за незалежнасць




Алегер Прэсас: патрыёт Каталоніі

## Вера ЧАСЛАЎСКА: «Дзве тысячы слоў»

Адна з наймацнейшых спартыўных гімнастак свайго часу, чэхаславацкая спартсменка магла б выйграць і больш. Але пасля сямі залатых медалёў у Токіа – 1964 і Мехіка – 1968 яна стала невыязной з ЧССР. Прычына — «палітычная нядобранадзейнасць».

Пасля ўвядзення савецкіх войск у Прагу ў 1968 г. Вера не пабаялася паставіць подпіс пад знакамітым пісьмом «Дзве тысячы слоў».

Працяг на стар. 10 »

# Фізкульт-пратэст: сусветны спорт ніколі не быў па-за палітыкай



Вера Часлаўска: чэмпіёнка-антысаветчыца

« Працяг. Пачатак на на стар. 9

Толькі ў апошні момант ёй далі дазвол на паездку ў Мехіка. А там у вольных практыкаваннях суддзі вырашылі прысудзіць не адзін, а два залатых медалі — акрамя Часлаўскай узнагародзіць яшчэ і прадстаўніцу СССР Ларысу Петрык (дарэчы, выхаванку беларускай школы гімнастыкі). Чэхаславачка, абураная такім рашэннем, падчас гімну СССР дэманстратыўна апусціла галаву долу і ўбок. Дэмакратычныя сілы ЧССР сустрэлі жэст вельмі станоўча, а вось для камуністычнага рэжыму Часлаўска адразуператварылася ў персону нон-грата.

Тым не менш спартсменка на дзесяцігоддзі стала сімвалам барацьбы за дэмакратыю, а пасля змены палітычнага ладу ўзначаліла Нацыянальны алімпійскі камітэт, стала членам МАК ад Чэхіі і саветнікам прэзідэнта Вацлава Гавела па фізкультуры і спорце.

## Хакан ШУКЮР хацеў сваёй краіне пераменаў

Найлепшы бамбардзір у гісторыі футбольнай зборнай


Хакан Шукюр: турэцкі выгнаннік

Турцыі, аўтар самага хуткага гола ў фінальных турнірах чэмпіянату свету, сапраўдны ідал заўзятараў стамбульскага «Галатасарая», узяўшы для туркаў першы ў гісторыі Еўракубак... Знакаміты Басфорскі Бык мог бы жыць прыпяваючы пры рэжыме Эрдагана, але ён хацеў для сваёй краіны пераменаў. Шукюр дэманстратыўна выйшаў з Партыі справядлівасці і развіцця пасля забароны дзейнасці на тэрыторыі Турцыі галоўнага палітычнага канкурэнта Эрдагана — ісламскага вучонага і пісьменніка Фетхулы Гюлена. У 2016 г. былога форварда абвінавацілі ў абразе прэзідэнта і выпісалі ордэр на арышт за ўдзел у тэрарыстычнай арганізацыі (гэты статус надалі партыі Гюлена). Шукюр вымушаны быў збегчы ў ЗША, дзе зараз прадае кніжкі і працуе кіроўцам Uber. Усе яго рахункі і маёмасць у Турцыі адышлі ўладам.

## Кімія АЛІЗАДЭ — адна з мільёнаў

«Яны бралі мяне, куды хацелі, я насіла тое адзенне, якое яны казалі, я паўтарала ўсё, што яны ад мяне патрабавалі, яны эксплуатавалі мяне, калі жадалі. Я не хачу больш сядзець за сталом крывадушнасці, ілжы, несправядлівасці і лёсткі... Я — адна з мільёнаў прыгнечаных жанчын....» — так развіталася з радзімай адзіная ў гісторыі Ірана алімпійская прызёрка. Таэквандзістка Кімія Алізадэ ўзяла бронзу ў Рыа – 2016, а ў 2020 г. уцякла з краіны.У знак пратэсту Кімія адмовілася ад выступу за Іран у Токіа – 2020.

## Вон ХО-ЧУН — непажаданы

Выдатны ганконгскі бягун быў галоўным прэтэндэнтам на прыз «Залаты насарог». Але з-за падтрымкі дэмакратычных пратэстаў у краіне яго хутка выкраслілі з усіх спісаў — за «антыкітайскія інтэрв'ю». Да таго ж Вон дапамагаў пацярпелым удзельнікам дэманстрацый у Юэнь-Лоне. Спартовец працягвае сцвярджаць: «Я збольшага па-за палітыкай. Але ў Пекіне слухаць не хочуць».

## Фейіса ЛІЛЕСА салідарны з арома

Эфіопскі стаер выбраў для выказвання сваёй грамадзянскай пазіцыі лепшы момант



Вон Хо-Чун: бягун пратэста

— срэбраны фініш у Рыа – 2016. Спартсмен узняў скрыжаваныя рукі над галавой у знак салідарнасці з народнасцю арома, якую гвалтам прымушалі з'ехаць з родных мясцін вакол Адыс-Абебы —



Фейіса Лілеса: крыж свабоды

там планавалася капітальная забудова. З-за сваёй пазіцыі Лілеса вымушаны быў два гады пражыць за мяжой. Толькі пасля адстаўкі былога прэм'ер-міністра Хайлемарыяма Дэсалегна, новы — Абій Ахмед — запрасіў атлета вярнуцца ў родную краіну.

## Колін КАПЕРНІК: «Я не буду ганарыцца сцягам краіны, якая зневажае людзей з іншым колерам скуры»

Куотэрбэк з амерыканскага футбола няблага гуляў шэсць сезонаў за «Сан-Францыска 49эрс». Але пасля навінаў пра неадэкватныя паводзіны паліцыі (забойства і шматлікія выкарыстанні агнястрэльнай зброі без асобых падстаў) вырашыў пратэставаць, не падняўся падчас выканання амерыканскага гімна перад таварыскай гульнёй напярэдадні сезона – 2016. «Я не буду ганарыцца сцягам краіны, якая зневажае людзей з іншым колерам скуры», — растлумачыў ён.

Каперні працягваў пратэсты ўсё міжсезонне, і на чацвёртай гульні ён устаў на адно калена — так і пачаўся аднакаленны пратэст BlackLivesMatter, які цяпер набраў сілу. Сам куотэрбэк увесь гэты час лячыўся ад атрыманых падчас гульняў траўмаў, звольніўся з «Сан-Францыска 49эрс», але вось ужо пяць гадоў не можа знайсці новую каманду. Як лічаць, ніхто не хоча звязвацца са скандальным футбалістам. Ён падаў у суд на лігу, але да працэсу справа не дайшла — НФЛ палічыла за лепшае дамовіцца па-добраму. Пошук клуба для спартоўца-актывіста працягваецца.

# Юрый Розанаў. Інтэлігентны, разумны, недаацэнены

Сяргей КАЙКО

**На пачатку вясны, 3 сакавіка, прыляцела сумная навіна. Пайшоў з жыцця Юрый Розанаў — вядомы на ўсю постсавецкую прастору спартыўны тэлекаментатар. Апошнія гады ён пакутаваў на цяжкую хваробу. Да свайго 60-годдзя не дажыў крыху больш за тры месяцы.**

«Юра Розанаў памёр. Найлепшы спартыўны каментатар новых часоў. Інтэлігентны, разумны, недаацэнены. Юра перажыў інсульт некалькі гадоў таму, але, здавалася, выбраўся... Эх. Светлая памяць...» — напісаў з журботнай нагоды пісьменнік і шматгадовы заўзятар Віктар Шэндэровіч. І трапіў, як кажуць у футболе, у самую «дзявятку».



Для многіх Розанаў сапраўды быў найлепшым, хаця рамяство спартыўнага тэлетамады засвоілі ў наш інфармацыйны век многія. Скрозь пастаўленыя галасы і падвешаныя языкі — на ТВ і радыё, у Youtube ды «Яндэкс-эфіры». Ёсць што паглядзець, каго паслухаць з футбольнай Лігі чэмпіёнаў ці хакейнай КХЛ — вушы, як бывала раней, не вянуць.

Аднак такіх, як Розанаў, у «скрыні» больш не было. Згадацую інтэлігентнасць ён спалучаў з энергетыкай. Згаданы розум сумяшчаў з тонкім гумарам. Яго стыль імкнуліся пераймаць — у гэтай прафесіі такое вельмі распаўсюджана — але ніхто з паслядоўнікаў нават не наблізіўся да арыгінала. Бо веды, узятыя яшчэ са старых папяровых носьбітаў, у легкадумным сецібе сёння не знойдзеш. Бо густ — моўны і літаратурны — дзе яго набыць?..

Энергетык паводле адукацыі, ён доўга мыкаўся па розных НДІ, пакуль падсвядомасць не падштурхнула яго да жыццёвага прызначэння. Да мікрафона і каментатарскай кабіны ён прыйшоў недаравальна позна — у 35 гадоў, калі некаторыя пачынаюць ужо выгараць. Прыйшоў мажным пераросткам — і наўпрост з вуліцы, вытрымаўшы конкурс нароўні з амбітным маладняком. Яму былі адведзеныя два дзясяткі гадоў актыўнай творчасці, і часу Юрый Розанаў не марнаваў.

У футболе ён браўся за ўсё і ўсюды быў на вышыні — чэмпіянаты Англіі, Расіі, Іспаніі, Італіі, Галандыі, не кажучы пра Лігу чэмпіёнаў ды першынствы свету і Еўропы. З задавальненнем каментаваў хакей — тут больш выбарачна, аднак таксама адметна і яскрава. Ён быў на роўных са сваім гледачом, і гэта выклікала зваротны давер. Не баяўся памыліцца і заставаўся сабой — і гэта імпанавала шырокай аўдыторыі.

Напалову беларус (маці з нашых мясцін, выпускніца БДУ), часта і з задавальненнем згадваў пра гэты факт у інтэрв'ю беларускім журналістам, сярод якіх меў шмат знаёмых, а мо нават і прыяцеляў. У нулявых працаваў ва Украіне, пра якую таксама заўсёды выказваўся захоплена і ўдзячна. І ўсюды, калі было загадзя вядома, што матч пракаментуе Розанаў, заўзятары ўспрымалі гэта як дадатковы бонус. Бо ведалі: будзе што не толькі паглядзець, але і паслухаць. І ніколі не падманваліся ў сваіх чаканнях.

«Памёр Юрый Розанаў — чалавек, якога паважалі ўсе», — з такім загалоўкам 3 сакавіка выйшаў тэкст на «Еўраспорце». І ў гэтым пасыле не было ні пафасу, ні перабольшання.

Сутыкнуўшыся з цяжкай хваробай, ён не цешыў сябе ілюзіямі. Казаў: «Альбо памру, альбо буду працаваць». Зразумела, што спадзяваўся на лепшае, аднак тут яго стрэл прайшоў побач са штангай.

Голас Юрыя Розанава цяпер можна пачуць толькі ў архіўных запісах.